

РАБОЧАЯ ПРАФЕСІЯ: ПЕРАЗАГРУЗКА

ЧЫРВОНКА

МОЛАДЗЬ ДЛЯ «ХАТЫНІ» — ПРАВАДНІК ПАМЯЦІ

ЧЫРВОНКА




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

23 ЧЭРВЕНЯ 2022 г. ЧАЦВЕР № 121 (29743)


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Наталля КАЧАНАВА, Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу:**

*«Мы сваю работу стараемся выбудоўваць такім чынам, каб максімальна ўключаць дэпутацкі корпус у работу Савета Рэспублікі і вырашэнне задач, якія стаяць перад дэпутацкім корпусам і якія агучвў кіраўнік дзяржавы ў час сустрэчы з парламентарыямі. Гэтыя задачы зразумелыя кожнаму з нас. Мы — народныя выбраннікі, нас выбіраюць людзі, таму мы павінны зрабіць усё, каб дзяржаўная палітыка, выбудаваная ў нашай краіне, рэалізоўвалася і ўвасаблялася ў жыццё. Перш за ўсё гэта людзі з іх клопатамі, праблемамі і пытаннямі. Мы ўсе павінны жыць жыццём нашых людзей. Для чаго? Для таго каб своечасова вырашаць пытанні, якія ўзнікаюць у грамадзян, каб, прымаючы заканадаўчыя акты, мы маглі ўрэгуляваць пытанні, якія сёння не ўрэгуляваныя або патрабуюць дапрацоўкі».*

## КОРАТКА

• **Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ў Дзень усенароднай памяці ахвяр Вялікай Айчыннай вайны і генацыду беларускага народа недалёка ад сваёй малой радзімы ўсклаў кветкі да брацкай магілы ў вёсцы Хімы Аршанскага раёна.**

• Студэнты ГрДУ імя Я. Купалы правялі аўтапрабег па вёсках, якія пацярпелі ад фашысцкіх захопнікаў.

• **Беларускія паралімпійцы выступяць на летніх гульнях «Мы разам. Спорт».**





Фота Віктара ДРАЧОВА.

# БРЭСТ СМУТКУЕ, БЕЛАРУСЬ ПАМЯТАЕ

### У Брэсцкай крэпасці прайшлі маштабныя мерапрыемствы з нагоды Усенароднага дня памяці ахвяр вайны і генацыду беларускага народа

**Гэтым разам дні 21—22 чэрвеня ўмясцілі вельмі вялікую і разнастайную праграму мерапрыемстваў па ўсёй краіне. Але самыя важныя, самыя кранальныя і шчымлівыя з іх прайшлі ў крэпасці. Брэсцкую крэпасць цяпер амаль немагчыма ўявіць без Паста памяці, які нясе сваю вахту каля Вечнага агню вось ужо амаль 50 гадоў.**

Напярэдадні жалобнай даты, днём 21 чэрвеня, каля сцен цытадэлі прайшло ганаровае пастраенне ўдзельнікаў злёту пастоў памяці гарадоў-герояў. Гэта 17 дэлегацый з розных куткоў Беларусі і Расіі, якія ўдзельнічаюць у дзіцячым патрыятычным руху.

Цэлы дзень крэпасць наведвалі розныя дэлегацыі, патокам ішлі экскурсанты. А ў 19 гадзін па традыцыі каля скульптурнай кампазіцыі «Героям граніцы, жанчынам і дзецям, якія мужнасцю сваёй у бяссмерце крочаць» Інстытут пагранічнай службы Рэспублікі Беларусь правёў акцыю памяці «Баявы разлік». Мерапрыемства вось ужо сёмы раз ладзіцца каля сцен Брэсцкай крэпасці ў гонар герояў-пагранічнікаў, тых, хто 21 чэрвеня 1941 года ў 19 гадзін прайшоў рытуал прызначэння на ахову дзяржаўнай граніцы — баявы разлік, які аказаўся апошнім. Бо ў першыя ж хвіліны вайны ў бой з праціўнікам уступілі байцы пагранічных нарадаў. І, нягледзячы на тое, што падраздзяленням германскай арміі на захоп кожнай з застаў адводзілася гадзіна, нашы вартавыя граніцы трымаліся многія гадзіны, нават дні. Абараняліся да апошняга байца альбо апошняга патрона.

СТАР. 4

Выпрабавана на сабе

# МАЛАДЗІЛЬНЫЯ ЯГАДКІ,

### або Як сэканоміць на сезонных вітамінах



**Пару тыдняў таму мне так захацелася свежых ягад, што, праходзячы міма латкоў з чарэшнямі побач з тралейбусным прыпынкам, не ўтрымалася і набыла грамаў трыста. Хоць цэны тады яшчэ кусаліся: за кілаграм прывазных вітамінаў прасілі 16 рублёў. Рэдка хто з прадаўцоў дазваляе выбіраць ягады, таму можна ўявіць маё расчараванне, калі з той жменькі амаль траціну чарэшняў давялося выкінуць. Каляжанка казала, што таксама брала там клубніцы, але і яны, хоць і выглядалі прывабна, былі зусім ніякія: ні водару, ні смаку, быццам гумовыя. Распавяла я пра гэтыя няўдалыя спробы вітамінізавацца сяброўцы. А яна і кажа: «З'ездзі ў Самахвалавічы — там штогод ладзяць самазборы сезонных ягад. Мы летась сям'ёй збіралі там чарэшні, засталіся задаволеныя».**

СТАР. 5

ISSN 1990 — 763X


ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе

Мы абяцаем нясумнае лета з любімай газетай

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

Сувязь пакаленняў

# ЯК ВЫПРАЦАВАЦЬ ІМУНІТЭТ ДА РАДЫКАЛЬНЫХ ІДЭАЛОГІЙ?

## Новыя фарматы работы з моладдзю абмеркавалі ў Клічаве

**Удзельнікамі сустрэчы сталі кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар Сергеенка, памочнік Прэзідэнта — інспектар па Магілёўскай вобласці Леанід Мартынюк, старшыня Магілёўскага аблвыканкама Анатоль Ісачанка, старшыня абласнога Савета дэпутатаў Ірына Раінчык, прадстаўнікі ідэалагічнай вертыкалі рэгіёна, маладзёжнага парламента і моладзь вобласці, перадае БелТА.**


Фота БелТА.

«У краіне праходзіць Тыдзень моладзі пад слоганам «Моладзь Беларусі: памятаем традыцыі, жывём сучасным, імкнёмся ў будучыню». Беларусь — краіна міру і спакою, і вельмі хочацца, каб так было і ў далейшым. У нас ствараюцца неабходныя ўмовы для самарэалізацыі. Дзяржава аказвае істотную дапамогу маладым сем'ям, шматдзетным бацькам. Усё гэта трэба цаніць і не паддавацца на правакацыі. Нам неабходна захаваць тое, што маем, выхаваць у маладым пакаленні патрыятызм і любоў да Радзімы. Гэта штодзённая работа. Дзякуючы ёй моладзь павінна выпрацаваць імунітэт да радыкальных ідэалогій», — сказаў **старшыня Магілёўскага аблвыканкама Анатоль ІСАЧАНКА.**

Як адзначыла падчас выступлення **начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы і па справах моладзі аблвыканкама Кацярына МУЗЫЧЭНКА,** істотны ўплыў на грамадства і працэсы, якія ў ім адбываюцца, аказваюць каштоўнасныя арыенціры, погляды і інтарэсы моладзі. «Гэты ўплыў распаўсюджваецца на ўсе сферы жыцця: адукацыю, дэмаграфію, працу, клопат аб здароўі, інфармацыйную і прававу дасведчанасць і інш. Моладзь мае свае патрэбы, таму падтрымка дзяржавы на гэтым этапе жыцця найбольш значная. У Беларусі яна ажыццяўляецца па розных напрамках: адукацыя, магчымасць праявіць сябе ў творчай і навуковай дзейнасці, садзейнічанне занятасці, падтрымка маладых спецыялістаў і сем'яў», — падкрэсліла яна.

Паводле слоў Кацярыны Музычэнкі, колькасць моладзі ў Магілёўскай вобласці — больш за 171 тысячу (17 працэнтаў ад агульнай колькасці насельніцтва). Самыя маладзёжныя раёны — Клічаўскі, Горацкі і Слаўгарадскі, а таксама Магілёў і Бабруйск. Найбольш шматлікая ўзроставая група — 25—30 гадоў (38 працэнтаў). Згодна з сацыялагічнымі даследаваннямі, праведзенымі ў гэтым годзе, у топ-5 каштоўнасцяў моладзі рэгіёна ўваходзяць здароўе, сям'я і дзеці, фінансавая стабільнасць, цікавая работа і вольны час.

Сярод пытанняў, якія абмяркоўваюцца ў час пасяджэння, сталі новыя фарматы работы з моладдзю, пытанні захавання гістарычнай памяці і патрыятызму. Паводле слоў Кацярыны Музычэнкі, у рабоце з моладдзю неабходна поўнасцю выключыць фармальны падыход.

Яркім акцэнтам рабочай сустрэчы стала прэзентацыя выстаўкі «Нашы поспехі табе, Магілёўшчына!», дзе былі прэзентаваны самыя яркія маладзёжныя праекты, рэалізаваныя ў вобласці. Яны былі падзелены на некалькі блокаў. Інфармацыйныя праекты прэзентавалі СМІ рэгіёна, яшчэ адзін блок — прадстаўленне студатрадаўскага руху ў рэгіёне. Камандзір будатрада Беларуска-Расійскага ўніверсітэта «Тытан» Іван Івашкаў разам са сваімі юнакамі і дзяўчатамі паедзе працаваць у Якуцію. У іх камандзе 16 чалавек розных спецыяльнасцяў, будуць працаваць амаль два месяцы. «Будзем займацца добраўпарадкаваннем: укладваць плітку, рабіць дарогі, будаваць аб'екты сацыяльнай інфраструктуры на Чаяндзінскім нафтагазакандэнсатным радовішчы. А ў мінулым годзе нам пашанцавала паўдзельнічаць у будаўніцтве Беларускай АЭС», — расказаў ён.

Акрамя таго, кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар Сергеенка наведаў Клічаўскі краязнаўчы музей, дзе азнаёміўся з гісторыяй і дасягненнямі раёна, прадстаўленымі экспанатамі.

# У АГУЛЬНУЮ СКАРБОНКУ ПАМЯЦІ

**Манеты ад Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі і яго сям'і перададзены грамадскаму дзеячу, паралімпійцу Аляксею Талаю для стварэння памятнага знака «Жывая памяць удзячных пакаленняў», перадае БелТА.**



Манеты ад імя кіраўніка дзяржавы перадаў намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар Луцкі.

Для стварэння памятнага знака «Жывая памяць удзячных пакаленняў» больш за 130 тысяч манет ужо сабрана ад сем'яў з усёй Беларусі.

«У Год гістарычнай памяці народ аб'яднаўся. І мы вырашылі стварыць такі сапраўды народны помнік. Увесь народ сёння аб'ядноўваецца ў імя любові, дабра і справядлівасці, нашых вялікіх дзядоў і прадзедаў, якія адстаялі права на жыццё на планеце Зямля. Разам з нашым Прэзідэнтам мы гатовыя рэалізаваць самыя амбіцыйныя планы», — адзначыў Аляксей Талай.

Ён расказаў, што ўжо 22 чэрвеня, у Дзень усенароднай памяці ахвяр Вялікай Айчыннай вайны і генацыду беларускага народа, адліваюцца важныя часткі памятнага знака якраз з выкарыстаннем сабраных манет. Адкрыць помнік плануецца 2 ліпеня ў парку Перамогі напярэдадні Дня Незалежнасці. Запрошаны і кіраўнік беларускай дзяржавы.

Пачынаючы з лютага 2021 года, дабрачынны фонд імя Аляксея Талая рэалізоўвае праект «Дзеці Беларусі — ветэранам і будучым пакаленням» сумесна з Міністэрствам адукацыі, Міністэрствам культуры, Міністэрствам працы і сацыяльнай абароны і Беларускім дзяржаўным музеем гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Адна з асноўных падзей праекта — стварэнне і ўстаноўка ўсенароднага памятнага знака «Жывая памяць удзячных пакаленняў» у Мінску, Брэсце і Маскве. Галоўная ідэя стварэння і ўстаноўкі помнікаў — аб'яднаць ветэранаў, сучаснікаў і будучыя пакаленні.

Сабраныя манеты трапяць у сплаў помніка. Гэта манеты ад сем'яў з усёй Беларусі.

Вобраз помніка грунтуецца на дынаміцы застылага часу і ўключае ў сябе два складнікі: акамянелае пісьмо-трохкутнік, якое ўвасабляе даніну мінуламу, і бронзавае дрэва — сімвал жыцця і даўгалецця. Памятны



знак размесціцца ў парку Перамогі. Цяпер завяршаюцца яго ліццё і мантаж. Памятны знак установяць 27 чэрвеня.

Манеты будуць расплаўлены і заліты ў ствол дрэва і ў злiткі, якія будуць захоўвацца ў Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны ў Мінску для вырабу памятнага знака ў Маскве (9 мая 2023 года) і ў Брэсце (28 ліпеня 2023 года).

Фота БелТА.

Па сутнасці

# СПАДЧЫНА ПЕРАМОЖЦАЎ



**Дождж. Цёплы і лагодны. Альбо грозная навальніца. Дождж розны. Але ён заўжды акрапляе гэтымі днямі нашу зямлю. І нават калі мы ўсе забудземся пра тую нагоду жалобы. Калі мы настолькі «дэмакратызуемся», што дазволім таптаць нашу зямлю з сімваламі крыві і роспачы. Калі замест кіраўнікоў у нас будуць часовыя служкі заходніх інтарэсаў. Калі падчас панавання над нашым розумам талерантнасці і мультыкультуралізму зарастуць сцежкі да апошняга абеліска з чырвонай зорачкай. Калі ад першых нот гімна абароны Айчыны Аляксандрава перастануць бегаць па нашых целах мурашкі. Тады неба ўсё роўна будзе плакаць. Не можа яно інакш у самы працяглы дзень года.**

Нават калі мы забудзем дзяцей Хатыні і Чырвонага Берага. Адвернемся ад памяці пра замардаваных падпольшчыкаў у сутарэннях гестапа. Калі пачнём праводзіць парады нацыяналістаў, топчучы сціплыя магілкі, — апошняе прыстанішча народных герояў — партызан. Калі нам кінуць, а мы, нібы пад кіраўніцтвам тэлеграмнага рэжысёра-ідэолага, падхопім «хопіць аб вайне». Калі фатаграфіі франтавікоў мы звязём на лецішча, каб не заміналі цацкам, прывезеным з заморскіх турнэ, альбо постмадэрновым «карцінам». Калі нашчадкі салдат Перамогі замест партрэтаў возьмуць у рукі сцяжкі з апошленымі колерамі вясёлкі. Тады неба ўсё роўна будзе плакаць. Плакаць слязьмі кожнага трэцяга загінулага, спаленага, замучанага. Сыпаць не попел, а кроплі ачышчальнай вады славянскай ахвяры.

Зараз не разумеюць мову душы, размаўляюць лічбавай лексікай. Пачакайце, а калі мы падлічым ненароджаных беларусаў. Пра матэрыяльныя страты і казаць нават не буду. Але гэты рахунак можна было б прад'явіць ужо, дарэчы, не такой камфортнай і не такой багатай Еўропе. Санкцыі. Спачатку няхай разлічацца па рахунках са спаленай Беларуссю. З нашчадкамі тых халопаў-беларусаў, што вызвалілі Польшчу ад гнёту нацызму.

А цяпер мяне турбуе, што застанецца ў тройчы вызваленай рускімі Іванамі «Эўропе», каб адплаціць нашчадкам багатыроў Суворава і Жукава, Кутузава і Ракасоўскага. Што «невярагодная» Еўропа можа даць таму сціпламу салдату, што выратаваў нямецкую дзяўчынку каля сцен Рэйхстага і ўсю Еўропу — ад жудаснага нацызму і знішчэння. Ёсць такое паняцце «Стакгольмскі сіндром». Напэўна, у Старога Свету якраз гэты сіндром да нацызму. І геапалітычная хвароба развіваецца разам з пражэрлівай вантробай, што апетытна імкнецца вайной пайсці «нах остэн».

Вайну яны пакінулі сучаснасці. Вайну супраць памяці аб нашых героях і супраць нашай Перамогі. І колькі б да таго хціва немцы не кляліся, раскідваючы сваю віну ў выглядзе сэканд-хэнду і некалькіх купюр. Менавіта да 22 чэрвеня 2022-га яны запланавалі пастаўкі цяжкай артылерыі ва Украіну. Сімвалічна. Раней супраць Брэсцкай крэпасці, зараз супраць мірных людзей Данбаса. Для пагардлівага еўрапейца звыклая справа «хрысціць» у сваю веру нескароных усходніх герояў стрэламі і снарадамі. Але калі раней яны ішлі свіннёй супраць усіх славян, дык зараз прызвычаіліся свінню падкладваць. Украінцы спакусіліся. Канешне, падручнікі гісторыі для аднаго народа за сорасаўскія грошы можна перапісаць. Перапісаць, але не змяніць. Тэўтоны застаюцца на дне Чудскага возера. А каля сцен адной толькі крэпасці над Бугам загінула ў тры разы больш нацыстаў хвалёнай 45-й дывізіі, чым за ўвесь час кампаніі ў Польшчы. Толькі параўнайце. Старая, мікалаеўская часу, Крэпасць, і тэрыторыя адной з найбуйнейшых еўрапейскіх краін. Яе абскубены арол ізноў спрабуе расправіць крылы «ад можа да можа», бо сапраўды ў Польшчы для немцаў была «кампанія», а з намі ВАЙНА.

Усё суадносна. Каб зразумець жахлівасць вайны, трэба спазнаць каштоўнасць міру. Мне здаецца, гэтую атмасферу нясць адюстроўвае Няміга. Чаму? Давайце палічым. Папершае, тут адчуваецца мір душы. Адразу некалькіх храмаў — пананванне малітвы. Над шматпавярховым трафікам спажывецкай культуры гандлёвых цэнтраў, над няўрымслівым гоманам лайтовай Зыбіцкай узвялічваецца галоўны сабор краіны. Архітэктурная дамінанта віленскага барока ўзвышаецца над канструктывізмам сучаснага будаўніцтва. Але яны пабеларуску мірна суіснуюць. Як сціплае духоўнае з матэрыяльным. Адпачывай. Целам і душой. Таму такое прывабнае гэтае месца і для гараджан, і для гасцей, і для турыстаў. А калі званіцы Свята-Духавага сабора пачынаюць «гаманіць» паміж сабой са званіцамі касцёла Найсвяцейшай Панны Марыі, то адчуваеш этнаканфесійны мір. А паміж імі ратуша. І кожнае імгненне гэтага міру па-беларуску адлічвае гадзіннік на гэтым сімвале самадастатковасці.

Нядаўна ў гэтых гістарычных лакацыях пейзажа мірнага жыцця ці то здымалі кіно, ці то быў вулічны спектакль. Але ўсю карціну — ад крыжоў храма да падэшвы набярэжнай Свіслачы — балюча працяў зычны і самы вядомы фрагмент Левітана. Пра вайну. Мурашкі па целе, развагі аб мінулым, ахінулі ўспаміны пра дзядулю-франтавіка, загінулых і спаленых родзічаў. У сучаснасць вярнуў грукат скейта і дзіцячы смех.

Мір. Таму мы маем права называць свае праспекты — праспектамі Пераможцаў. А на будынках велічны, як і наша гісторыя, надпіс: «Слава Пераможцам».

Яўген ПУСТАВОЙ.

Бяспека

# РАЗАМ СУПРАЦЬ ВЫКЛІКАЎ

**Пытанні міжнароднай бяспекі патрабуюць аб'яднання намаганняў усёй сусветнай супольнасці. Такое меркаванне на ўрачыстай цырымоніі адкрыцця міжнароднай выставы індустрыі бяспекі «Нацыянальная бяспека. Беларусь-2022» выказаў першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Максім РЫЖАНКОЎ, паведаміла БелТА.**



Міжнародная выстаўка прадоўжыцца да 25 чэрвеня, яна ўпершыню арганізавана Дзяржсакратарыятам Савета Бяспекі Беларусі пры падтрымцы Міністэрства ўнутраных спраў, Камітэта дзяржаўнай бяспекі, Аператыўна-аналітычнага цэнтра пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь і іншых ведамстваў. «Выстаўка, прысвечаная нацыянальнай бяспецы, — сапраўды маштабная падзея. Яе правядзенне, як і правядзенне іншых мерапрыемстваў, прадыктавана самім часам. Ад нас патрэбна аб'яднанне намаганняў для павышэння ўвагі да пытанняў міжнароднай бяспекі, а таксама кансалідацыя міжнароднай супольнасці для барацьбы з новымі, сучаснымі выклікамі і пагрозамі», — адзначыў Максім Рыжанкоў.

Першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта ўпэўнены: без памяці не можа быць мінулага, а без мінулага не можа быць будучыні. «Звернемся да трыццатых гадоў мінулага стагоддзя. Мы добра памятаем, хто падтрымліваў узбраеннем Германію, развіваў яе прамысловы патэнцыял і заахвочваў нацысцкую ідэалогію. Мы таксама памятаем, чым гэта ўсё скончылася. Да расчаравання куратараў, першы кідок быў зроблены не на Усход, а на Заходнюю Еўропу. Мы памятаем трагедыю, памятаем той шалёны ўраган, які практычна знішчыў ушчэнт усю Беларусь. Ён забраў жыцці кожнага трэцяга беларуса», — нагадаў Максім Рыжанкоў.

Нават у няпростыя саракавыя гады міжнародная супольнасці ўдалося знайсці агульную мову. «У вельмі складанай сітуацыі, нягледзячы на ўсе ідэалагічныя рознагалоссі, сусветная супольнасць села за мірны стол. Уся Еўропа тады была напоўнена зброяй. Але дзяржавам удалося знайсці магчымасць для стварэння нейкай новай структуры бяспекі і падтрымання. Прыгадваючы тыя часы, мы бачым, што сёння разбураюцца ўсе прызнаныя сусветнай супольнасцю архітэктуры бяспекі», — падкрэсліў першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта.

Падзеі ў свеце па канцэптуальным перафарматаванні існуючага светаўладкавання і развіцці шматпалярнасці ўзмацняюць рызыкі ў сферы міжнароднай і рэгіянальнай бяспекі. Аб гэтым заявіў **Дзяржаўны сакратар Савета Бяспекі Рэспублікі Беларусь Аляксандр ВАЛЬФОВІЧ.** «Назіраецца шматразовае павелічэнне ваенных расходаў і колькасці вучэнняў, дэмантаж сістэмы кантролю над узбраеннямі. Зніжаецца аўтарытэт найважнейшых арганізацый у сферы бяспекі, перагаворныя пляцоўкі якіх сталі інструментамі забеспячэння інтарэсаў асобных краін і саюзаў, — сказаў Аляксандр Вальфовіч. — Дэградацыя міжнароднай сістэмы бяспекі ўяўляе пагрозу для любой дзяржавы».

Паводле слоў дзяржсакратара Савета Бяспекі, Беларусь прыкладае значныя намаганні для ўмацавання нацыянальнай бяспекі, у тым ліку актуалізуецца нарматыўна-прававая база, развіваецца матэрыяльна-тэхнічнае аснашчэнне суб'ектаў яе забеспячэння. Гэты вектар пакладзены ў аснову парадку дня міжнароднай выстаўкі індустрыі бяспекі, першага комплекснага міжнароднага мерапрыемства для дэманстрацыі найбольш актуальных і перспектыўных тэхналогій у гэтай сферы. Наша краіна адкрытая для сяброўскіх крокаў і вырашэння пытанняў мірным шляхам. «Беларусь заўсёды праводзіла міралюбівую і дружалюбную палітыку, заснаваную на супрацоўніцтве і вывучэнні найлепшых напрацовак, якія садзейнічаюць забеспячэнню нашай нацыянальнай бяспекі», — адзначыў Аляксандр Вальфовіч.

Рэальныя пагрозы нацыянальнай бяспецы, асобе, грамадству і дзяржаве ўсё яшчэ актуальныя. Такім меркаваннем падзяліўся **Генеральны сакратар АДКБ Станіслаў ЗАСЬ.** «Вядома, увага многіх краін прыкавана да таго, што адбываецца на поўдні ад нас, ва Украіне. Разам з тым іншыя рэальныя пагрозы нацыянальнай бяспецы, асобе, грамадству і дзяржаве нікуды не падзеліся», — адзначыў Станіслаў Зась. На яго думку, гэтыя праблемы застаюцца актуальнымі ў тым ліку для краін АДКБ. «Сярод іх — інфармацыйныя, тэрарыстычныя і біялагічныя пагрозы. Востра стаяць праблемы экстрэмізму і незаконнага наркатрафіку. Калі ўсе гэтыя пытанні знаходзяць сваё адлюстраванне ў тэхнічных дасягненнях і распрацоўках, гэта трэба толькі вітаць, — заўважыў генеральны сакратар АДКБ. — Безумоўна, усё гэта ідзе на карысць тых праваахоўных органаў і спецыяльных падраздзяленняў, якія займаюцца мінімізацыяй такіх пагроз».

# ПОБАЧ З РОДНЫМІ

## На Вайсковых могілках з'явілася мемарыяльная дошка ў гонар сярэдняга сына Якуба Коласа, які без вестак прапаў на фронце



**Ён нарадзіўся ў 1917 годзе ў Пярмі, дзе сям'я апынулася ў якасці бежанцаў, хлопчыка ахрысцілі Георгіем, але родныя заўсёды называлі яго Юркам. Пасля заканчэння БДУ ў 1940-м Юру разам з іншымі выпускнікамі прызвалі на вайсковую службу. Сям'я паспела атрымаць некалькі лістоў ад яго, апошні датуецца 30-м верасня 1941 года. З таго часу ад Юры не было ніякіх звестак — Якуб Колас нават звяртаўся да сына па радыё, але адказу так і не атрымаў.**

Дачка малодшага сына Якуба Коласа, Марыя Міцкевіч, падзялілася ўспамінамі бацькі аб перадваенных днях, калі сям'я бачыла Юру апошні раз:

— Мой бацька Міхась вельмі любіў брата Юрку — заўсёды раўняўся і хацеў быць падобным да яго. Ён распавядаў аб іх апошняй сустрэчы. Юра прыехаў у Мінск, і яны разам пайшлі на спаборніцтвы па стэндавай стральбе. Бацька з захапленнем успамінаў, як ён радаваўся, гледзячы на кавалачкі талерак, што разбіваліся пры трапных стрэлах Юркі. Іх апошняя сустрэча адбылася 24 чэрвеня — Юра збіраўся ў ваенкамат. Ён папрасіў майго бацьку зберагчы яго стрэльбы. Яны развіталіся, не ведаючы ў той момант, што гэта ўжо назаўсёды. У хуткім часе пачалася бамбёжка Мінска. Сям'я вырашыла пакінуць горад. Яны збіраліся вельмі хутка, беручы з сабой толькі неабходныя рэчы. Але бацька забраў стрэльбы і Юркаў фотаапарат. Таварныя вагоны, Ляўкі, Падмаскоўе, Ташкент — бацька зберагі гэтыя стрэльбы і быў вельмі ўзрадаваны, калі прыйшоў ліст ад Юры. У ім сярэдні сын Коласа напісаў: «Міхаська, дзякуй, што ты захаваў мае стрэльбы. Мы паб'ём гэтых фашыстаў. Я вярнуся дамоў, і будзем разам хадзіць на паляванне, страляць качак». Але Юрка не вярнуўся.

Адкрыццё дошкі ў гонар Георгія Канстанцінавіча было здзейснена дзякуючы намаганням супрацоўнікаў Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа. Куратарам праекта стала праўнучка Якуба Коласа Васіліна Міцкевіч:

— Над гэтым праектам музей працаваў не адзін год. Аўтарам ідэі з'яўляецца колішні дырэктар музея Якуба Коласа Аляксандр Храмой, які цяпер узначальвае Нацыянальны гістарычны музей. Пазней гэтую ідэю пераняла сённяшні дырэктар музея Якуба Коласа Ірына Мацяс. Дзякуючы яе намаганням праект атрымаў канчатковы выгляд. Лічу, што ў год 140-годдзя з дня нараджэння класіка адкрыццё дошкі ў гонар яго сярэдняга сына на Вайсковых могілках — вельмі сімвалічная падзея. Бо сапраўды: сюды прыходзяць шмат людзей, каб аддаць даніну памяці класіку беларускай літаратуры. У наведвальнікаў з'явіцца добрая нагода, каб даведацца аб лёсе Юрыя Канстанцінавіча Міцкевіча.

Аўтарам мастацкага вырашэння мемарыяльнай дошкі стаў скульптар, сябра Беларускага саюза мастакоў Максім Пятруль. Творца распавёў, што падчас работы над дошкай уяўляў Якуба Коласа не толькі як вядомага пісьменніка, але і як мужчыну, бацьку сямейства:

— Мне хацелася, каб дошка была лаканічнай і выразнай. Почыркам Якуба Коласа напісаны драматычныя радкі: «Яфрэйтар Міцкевіч Георгій (Юрый) Канстанцінавіч // I.V.1917 — у верасні 1941 года прапаў без вестак пад Вязьмай». Гэтыя словы застануцца тут, побач з мемарыялам усёй коласаўскай сям'і.

**Арына КАРПОВІЧ.**
**Фота Лізаветы ГОЛАД.**

Падрабязнасці

# ЗАМЕСТ «КОВІДНЫХ» НАДБАВАК — СТЫМУЛЯЦЫЙНЫЯ ВЫПЛАТЫ

**Намеснік міністра аховы здароўя Дзмітрый ЧАРАДНІЧЭНКА пракаментаваў, як змяніцца аплата працы медыцынскіх работнікаў пасля адмены «ковідных» надбавак.**

Ён адзначыў, што Указ № 131, які прадугледжваў гэтыя надбаўкі, быў прыняты ў 2020 годзе, калі Беларусь сутыкнулася з каранавіруснай інфекцыяй. Дакумент дазволіў аказаць неабходны аб'ём медыцынскай дапамогі пацыентам ва ўмовах пандэміі і захаваць кадравы патэнцыял працаўнікоў галіны. Дзякуючы ўказу значна павялічыўся памер аплаты працы работнікаў галіны.

Паводле слоў намесніка міністра, цяпер эпідэміялагічная абстаноўка стабілізавалася, захваральнасць на COVID-19 нязначная, насельніцтва правакцынаванае. Указ № 131 адменены. Замест яго Міністэрства аховы здароўя распрацавала пастановы, якія ў найбліжэйшы час будуць прыняты. Уведзена новая стымуляцыйная выплата ўсім урачам і сярэднім медыцынскім работнікам — надбаўка за работу ў сферы аховы здароўя.

У залежнасці ад складанасці і інтэнсіўнасці працы ўстаноўлены большы памер надбаўкі спецыялістам у прыёмных аддзяленнях стацыянараў, аддзяленнях анестэзіялогіі і рэанімацыі, аддзяленнях для пацыентаў з інсультамі, выязных брыгадах хуткай медыцынскай дапамогі, участковай службе паліклінік. Таксама ўстаноўлена надбаўка за асаблівасць прафесійнай дзейнасці малодшым медыцынскім сёстрам, санітаркам прыёмных аддзяленняў стацыянараў, аддзяленняў (палат) для пацыентаў з інсультамі, выязных брыгад хуткай медыцынскай дапамогі, аддзяленняў (палат) анестэзіялогіі і рэанімацыі.

— Як і даручаў Прэзідэнт, дакументамі Міністэрства аховы здароўя «ковідныя» надбаўкі трансфармаваны ў іншыя стымуляцыйныя выплаты, што дазволіць павысіць заработную плату ўсім медыцынскім работнікам, а не толькі пацыентам з COVID-19, якія аказваюць медыцынскую дапамогу, — падкрэсліў Дзмітрый Чараднічэнка.

Міністэрства аховы здароўя працягне штомесячны кантроль узроўню аплаты працы ўсіх медыцынскіх работнікаў.

**Алена КРАВЕЦ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Ахвярамі землятрусу ў Афганістане сталі больш чым 900 чалавек



Пра гэта паведаміў на прэс-канферэнцыі намеснік міністра па ліквідацыі наступстваў стыхійных бедстваў Афганістана Маўлаві Шарафудзін Муслім, перадало інфармацыйнае агенцтва Aamaj News. Таксама паведамляецца, што звыш 600 чалавек атрымалі раненні. Кабінет міністраў Афганістана правёў экстраннае пасяджэнне ў сувязі з землятрусам. «Урад даручыў адпаведным ведамствам накіраваць у раён групы экстраннай дапамогі, — напісаў у «Твітэры» афіцыйны прадстаўнік руху «Талібан» Забіула Муджахід. — Былі прыняты меры па аказанні грашовай дапамогі родным загінулых і лячэнні параненых». Кабмін распарадзіўся выкарыстоўваць увесь наяўны паветраны і наземны транспарт для дастаўкі пацярпелым харчавання, адзення, медыкаментаў і іншых прадметаў першай неабходнасці, а таксама перавозкі параненых. Землятрус адбыўся ўначы з 21 на 22 чэрвеня. У павеце Гаян правінцыі Пактыка была цалкам разбурана вёска, вялікія ахвяры былі ў вёсцы Дандакі павета Шпор правінцыі Хост. Паводле папярэдніх даных, магнітуда землятрусу, які закрануў правінцыі Пактыка, Пакція, Хост, Лагман, Газні, Логар і Кабул, склала 6,1 па шкале Рыхтэра. Яго ачаг залягаў на глыбіні 51 км. Адзначаецца, што падземныя штуршкі адчулі каля 120 млн чалавек у Пакістане, Афганістане і Індыі.

## Прэм'ер-міністр Шры-Ланкі заявіў, што эканоміка краіны «цалкам абрынулася»

Зараз дзяржава не можа дазволіць сабе купляю імпартнай нафты, заўважыў Раніл Вікрамасінгхэ. «Мы сутыкнуліся з сітуацыяй, якая значна больш сур'ёзная за простыя недахоп паліва, газу, электрычнасці і харчавання», — цытуе кіраўніка ўрада агенцтва Associated Press. Прэм'ер-міністр паведаміў, што доўг найбуйнейшай нафтагазавай кампаніі Шры-Ланкі Ceylon Petroleum Corporation на сёння складае $700 млн, у сувязі з чым «ні адна краіна або арганізацыя свету не гатова даць нам паліва». Па словах Вікрамасінгхэ, урад не змог своечасова прыняць меры, каб змяніць сітуацыю, паколькі золатавалютныя рэзервы Шры-Ланкі скараціліся. Цяпер у краіне амаль няма бензіну, а таксама назіраецца недахоп іншых відаў паліва, імпартнага харчавання і лекаў.

## Еўропе варта рыхтавацца да поўнага адключэння газу ўзімку

У Міжнародным энергетычным агенцтве (МЭА) заклікалі Еўропу весці падрыхтоўку да поўнага спынення экспарту Расіяй газу будучай зімой. Пра гэта паведаміла РБК. Кіраўнік структуры Фаціх Біроль заклікаў неадкладна пачаць падрыхтоўку да такога развіцця падзей. Паводле яго слоў, прадвеснікам далейшага пагаршэння сітуацыі з'яўляецца рашэнне Расіі скараціць пастаўкі газу ў еўрапейскія краіны. Для вырашэння пытання ў МЭА прапануюць кіраўніцтву еўрапейскіх краін прыняць меры па скарачэнні ўнутранага попыту на газ, а таксама прыкласці ўсе намаганні для падтрымкі існуючых атамных электрастанцый.

# БРЭСТ СМУТКУЕ, БЕЛАРУСЬ ПАМЯТАЕ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Гэта ў іх гонар, а таксама ў гонар усіх пагранічнікаў, якія загінулі ў гады вайны, на плошчы перад помнікам героям граніцы выстраіліся курсанты Інстытута пагранічнай службы з партрэтамі байцоў Беларускай пагранічнай акругі. Пачалася пераклічка:

— Начальнік 9-й заставы 105-га пагранатрада Іларыён Сямёнавіч Аляксееў!

— Кулямётчык 1-й заставы 17-га пагранатрада чырвонаармеец Міхаіл Васільевіч Андрыянаў!

— Начальнік 9-й заставы 17-га пагранатрада Герой Савецкага Саюза Андрэй Мітрафанавіч Кіжаватаў!..

І адказ у кожным выпадку быў аднолькавы: «Паў смерцю храбрых за свабоду і незалежнасць нашай Радзімы».



Гэтым разам мерапрыемства наведаў спецыяльны госць — заслужаны артыст Расіі Андрэй Мярзлікін, які сыграў ролю лейтэнанта Кіжаватава ў фільме «Брэсцкая крэпасць».

У 2010 годзе прэм'ера фільма адбылася вось тут, у крэпасці, і пачыналася ў дзве гадзіны ночы. Таксама ішоў невялікі дождж... А сёлета цішыню, якая тут адчуваецца пасабліваму, калі яшчэ зусім не пяюць птушкі, пранізліва разарвалі гукі «Рэквіема». Твор Дзмітрыя Кабалеўскага выканалі Дзяржаўны акадэмічны сімфанічны аркестр Беларусі пад кіраўніцтвам мастацкага кіраўніка і галоўнага дырыжора Аляксандра Анісімава, Дзяржаўная акадэмічная капэла імя Р. Шырмы, Дзяржаўны камерны хор, Акадэмічны хор НГТРК, а таксама салісты і чытальнікі.



Музыка гэтага велічнага твора прымушала сціскацца сэрца, абуджала думкі, развагі, выклікала смутак. Менавіта «Рэквіем» стаў пралогам да жалобных мерапрыемстваў, якія заўсёды пачынаюцца тут у чатыры гадзіны раніцы. Урачыста выносіцца Сцяг Брэсцкай крэпасці. Пачынаецца мітынг.

— Прайшло больш за 80 гадоў з таго дня, а мы беражліва захоўваем памяць пра герояў, тых, хто здабыў для нас мір, адстаяў свабоду і незалежнасць. Да гэтай пары адкрываюцца новыя трагічныя старонкі гісторыі вайны, — сказаў **старшыня Брэсцкага аблвыканкама Юрый ШУЛЕЙКА.** — Толькі ў ходзе расследавання крымінальнай справы аб генацыдзе ў Брэсцкай вобласці выяўлена 26 раней невядомых месцаў знішчэння мірных грамадзян. Усяго было разбурана і знішчана больш за 800 населеных пунктаў. Мы не павінны дапусціць, каб фашызм і нацызм паднялі галовы і пусцілі карані



на нашай зямлі. Гэта наш абавязак перад ветэранамі і шматлікімі ахвярамі Вялікай Айчыннай вайны. Мы павінны захаваць памяць...

Адным з самых шчымлівых і эмацыянальных момантаў начных мерапрыемстваў, на маю думку, заўсёды становіцца спусканне вянкоў па Бугу, што праводзяць вартавыя граніцы. У памяць пра загінулых па даўняй традыцыі спускаюцца вянкі з запаленымі свечкамі на воды Заходняга Буга. Іх пранеслі і апусцілі ў раку сённяшнія вайскоўцы, равеснікі тых, хто аддаў жыццё ў 1941-м. Як толькі вянкі паплылі па вадзе, у неба ўзляцелі белыя шары, нібы светлыя душы загінулых. Усё гэта праходзіць моўчкі і выклікае асаблівыя трапяткія пачуцці: вось тут яно ўсё адбывалася!

Цырымонія ўскладання кветак — таксама абавязковы рытуал ранішняга мітынгу. Да Вечнага агню і некропаля, пад плітамі якога ляжаць 1038 абаронцаў крэпасці — увекавечана толькі 277 імёнаў, астатнія застаюцца невядомымі, — усклалі кветкі кіраўнікі Брэста і вобласці, а таксама шматлікія госці мерапрыемстваў. Сярод іх — прадстаўнікі дэлегацый гарадоў, Саюзнай дзяржавы, Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі, дыпламатычных місій, расійскіх рэгіёнаў, грамадскіх арганізацый, удзельнікі патрыятычных акцый, у тым ліку «Цягніка Памяці», X Беларуска-расійскага маладзёжнага форуму.

Мітынг завяршыўся ганаровым маршам войскаў Брэсцкага гарнізона. А на Кобрынскім умацаванні тым часам пачыналася ваенна-гістарычная рэканструкцыя. Тэатралізаваная дзея стала лагічным працягам мерапрыемстваў на плошчы Цырыманіялаў. У ёй прымалі ўдзел больш за 300 рэканструктараў з розных краін свету, былі нават прадстаўнікі Японіі і Кітая.

Дзея пачалася з карцінкі апошняга мірнага дня, калі ў крэпасці ішлі заняткі па баявой і страявой падрыхтоўцы, побач гулялі дзеці камандзіраў, на пляцоўцы каля казематаў праходзіў канцэрт, пасля яго былі танцы. У парку побач гулялі шчаслівыя выпускнікі, закаханыя пары. А потым — грукатанне снарадаў, свіст куль, крыкі і стогны. З дапамогай фанаграм і артыстаў-рэканструктараў былі паказаны фрагменты артабстрэлу, нямецкай танкавай атакі, а таксама контратакі лічаных абаронцаў, прарыў групы маёра Гаўрылава, здача ў палон раненых, жанчын і дзяцей крэпасці, аплакванне загінулых.

Рэканструкцыя працягвалася каля гадзіны. Паглядзець на аднаўленыя падзеі 1941-га года сабралася звыш 15 тысяч гледачоў.

# ПЕРАКЛІЧКА АГУЛЬНАЙ ПАМЯЦІ



## У сценах легендарнай крэпасці прайшла прэзентацыя кнігі «Партызанскі рух у гады Вялікай Айчыннай вайны», якая ўбачыла свет у Выдавецкім доме «Звязда»

**Пераклічкай агульнай памяці назваў адзін з удзельнікаў мерапрыемства круглы стол па праблемах захавання гістарычнай памяці. Пасяджэнне адбывалася ў дзвюх дзяржавах адначасова. На сувязі з канферэнц-залай Брэсцкай крэпасці быў Цэнтральны музей Вялікай Айчыннай вайны ў Маскве. І калі ў 12 гадзін у Беларусі была аб'яўлена хвіліна маўчання, акцыю падтрымалі маскоўскія ўдзельнікі.**




Сустрэчу адкрыў **дзяржаўны сакратар Саюзнай дзяржавы Дзмітрый МЕЗЕНЦАЎ.** Ён падкрэсліў, што ў сучасных умовах абарона гістарычнай памяці і гістарычнай праўды становіцца ўсё больш актуальнай. Тры гады таму нарадзілася традыцыя ў сценах Брэсцкай крэпасці прадстаўляць кнігі, прысвечаныя экспазіцыям ваенна-гістарычных музеяў. Сёлета прадстаўлена кніга «1941—1944. Беларусь — Расія. Партызанскі рух у гады Вялікай Айчыннай вайны», якая стала чарговым праектам Пастаяннага камітэта Саюзнай дзяржавы.

Дзмітрый Мезенцаў адзначыў, што першыя экзэмпляры выдання ўжо перададзены на рабочыя сталы прэзідэнтам краін Аляксандру Лукашэнку і Уладзіміру Пуціну. Дзяржсакратар выказаў спадзяванне, што кніга не проста ляжа на паліцы бібліятэк, але стане нагодай для абмеркавання перш за ўсё ў школах, ВНУ, любых маладзёжных калектывах.

**Губернатары Брэсцкай і Бранскай абласцей — Юрый ШУЛЕЙКА і Аляксандр БАГАМАЗ** — расказалі, як падтрымліваецца памяць аб вайне ў іх рэгіёнах.

— Брэстчына — край помнікаў і абеліскаў. На жаль, — сказаў Юрый Шулейка. — У нас у кожным горадзе, кожнай, нават самай малой, вёсцы ёсць помнікі ахвярам вайны. І цяпер многія з гэтых помнікаў мы аднаўляем.

Яго калега Аляксандр Багамаз паведаміў, што на Браншчыне ў гады вайны дзейнічала 139 партызанскіх атрадаў, а 12 партызан Браншчыны былі ўдастоены звання Героя Савецкага Саюза. Згадалі і легендарнага бранскага партызана Міхаіла Рамашына, які вызначыўся ўдалай аперацыяй, што на месяц затармазіла рух варожых войскаў. Вось такім людзям і прысвечана новае выданне.

На круглым стале як у Брэсце, так і ў Маскве прысутнічала нямала маладых людзей, былі і школьнікі. Менавіта ім адрасаваны падобныя выданні, да іх душ і сэрцаў імкнуцца дастукацца аўтары. Дзмітрый Мезенцаў на правах вядучага пасяджэння задаваў пытанні юным удзельнікам, прыцягваў іх да гутаркі, цікавіўся меркаваннямі пра іх асабістае адчуванне гэтай тэмы — тэмы вайны і захавання памяці пра яе. Прагучала прапанова ў наступныя гады даручыць арганізацыю і правядзенне такога мерапрыемства маладым людзям. На неабходнасць работы з моладдзю, на пошук новых фарматаў работы акцэнт зрабіў **намеснік старшыні Савета Федэрацыі Расіі Канстанцін КАСАЧОЎ.**

Тэму працягнуў **міністр інфармацыі Рэспублікі Беларусь Уладзімір ПЯРЦОЎ.** Паводле яго меркавання, тая сітуацыя, якую мы маем на інфармацыйнай прасторы, у нейкай меры стала вынікам заспакаення ў мінулыя гады. Маўляў, мы ўсё ведаем пра вайну, усё сказана, усё напісана, і праўда пра вайну — непахісная. Аказалася, што не так, што апаненты тым часам не драмалі. І светапогляд пакалення 1990-х гадоў нараджэння склаўся пад уплывам асобных інтэрнэт-рэсурсаў і пэўнага інфармацыйнага вакууму, калі пра некаторыя аспекты вайны гаварыць было быццам бы няёмка. Але надзею ўсяляе той факт, што цяперашняе маладое пакаленне разважае і думае па-іншаму. Значыць, ёсць сэнс у кнігах, пераглядзе вучэбных праграм, мастацкіх творах, якімі цяпер мы актыўна запаўняем прабелы. «Кніга з'яўляецца дастойным класічным правадніком той гістарычнай праўды, якую мы адстойваем і якая патрэбна маладому пакаленню», — сказаў міністр.

Менавіта кнігі, падобныя той, якую прэзентавалі ў Брэсцкай крэпасці, спрыяюць выпрацоўцы індывідуальнай гістарычнай свядомасці як асновы маральных прынцыпаў. Гэтая думка прагучала ў выступленні **дырэктара — галоўнага рэдактара Выдавецкага дома «Звязда» Аляксандра КАРЛЮКЕВІЧА.**

Агульная работа на карысць гістарычнай памяці працягваецца. Значыць, будуць новыя праекты, новыя выданні.

**Матэрыялы падрыхтавалі Святлана ЯСКЕВІЧ, Віктар ДРАЧОЎ *(фота).***

# МАЛАДЗІЛЬНЫЯ ЯГАДКІ...

## «Тут я хоць бачу, што збіраю»

На сайце Інстытута пладаводства я ўбачыла аб'яву, што 20 чэрвеня пачынаецца самазбор бружмелю. Пра гэтыя сінія ягады, якія знешне і па смаку нагадваюць буякі ды чарніцы, упершыню даведалася амаль два гады таму. Прыехалі з мужам да фермера па саджанцы. Набылі ўсё, што запланавалі, а ён і кажа: «Во вазьміце два кусцікі бружмелю, не пашкадуеце». Сёлета на тых кусціках з'явіўся першы ўраджай — жменька ягад. Наесціся ўдосталь пакуль не атрымаецца, таму ўзялі вядзерцы і выправіліся сям'ёй у Самахвалавічы. Аграгарадок месціцца за 13 кіламетраў ад Мінска. Выехалі раненька, думалі, будзем першыя. Але ў 9.00 каля плантацый з бружмелем ужо стаяла з дзясятак машын з мінскімі нумарамі.

— Бружмель — першыя ягады, якія саспяваюць у Беларусі: сезон звычайна пачынаецца ў канцы мая — пачатку чэрвеня, — распавядае па дарозе на ягадную плантацыю **старшы навуковы супрацоўнік аддзела ягадных культур РУП «Інстытут пладаводства» Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Марына ПІГУЛЬ.** — Але сёлета ў сувязі з такой позняй халоднай вясной тэрміны расцягнуліся. Людзі не маглі дачакацца: многія тэлефанавалі і пыталіся: калі ўжо можна прыязджаць?..

**«А для мяне збор ягад — своеасаблівая медытацыя пасля гарадскога шуму. Тут свежае паветра, сонечна, спакойна, паслухайце, як птушкі заліваюцца на ўсе лады», — кажа жанчына гадоў 40 у ружовым капелюшы.**

Перш чым пачаць збіраць, па парадзе Марыны Пігуль, ладзім дэгустацыю. Бо нават на суседніх кустах ягады могуць адрозніваццa. Смак вар'іруецца ад кіслага да кісла-салодкага і салодкага. Сустракаецца бружмель і з лёгкай гарчынкай. Як патлумачыла спецыяліст, гэта прыкмета характэрна для пэўных сартоў.

— Каму на варэнне, то можна збіраць усе ягады, — кажа Марына Пігуль. — Калі ж паласавацца, канешне, хочацца больш дэсертнага сорту. Бясспрэчна, лепш за ўсё есці ягады ў свежым выглядзе. У халадзільніку бружмель можа праляжаць тыдзень-два пры ўмове, што ягады сухія і цэлыя, без разрыву скуркі. Каб захаваць даўжэй, я, напрыклад, пераціраю бружмель з садовымі суніцамі і замарожваю. На мой погляд, гэтыя ягады вельмі каштоўныя для варэння.

Пакуль мы смакуем ягадкі (дарэчы, есці іх тут можна ў неабмежаванай колькасці, ніхто над табой не стаіць і ў рот не зазірае), на поле падцягваюцца ўсё новыя і новыя людзі з вядзерцамі. Многія з іх, як і мы, тут упершыню. «Я з сынам прыехала, — ахвотна ўступае ў размову бабуля з кіёчкам,

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)



Нашы вядзерцы пацягнулі на два кілаграмы, заплацілі мы за іх 20 рублёў.

якая схавалася ў цянёк, каб перадыхнуць. — Неяк не падумала адзелася ва ўсё чорнае, спякотна. Па тэлевізары перадавалі, што можна прыехаць сюды пазбіраць бружмель. Я пра гэтыя ягады раней не чула. Залезла ў інтэрнэт, пачытала. Аказваецца, гэта ягада маладосці. Кажу сыну, ён не так даўно на пенсію выйшаў: «А давай з'ездзім, амаладзімся хоць» *(смяецца)*.

Яшчэ адзін мужчына гадоў сарака прыехаў пазбіраць ягады з братам. «Калі ехаў, было столькі энтузіязму, — кажа. — Ажно пяцілітровае вядро ўзяў. Думаў, зараз хуценьканазбіраю. Але вось ужо гадзіна прайшла — добра калі літр будзе. Без досведу збіраць цяжка. У нас на лецішчы ёсць некалькі кусцікаў бружмелю, але на іх ягады нейкія кіславатыя. А тут я знайшоў салодкі сорт. Вось завязу хоць крыху жонцы пакаштаваць».

Маю ўвагу прыцягнула вялікая сям'я: акрамя бацькоў з дзецьмі, збіраць ягады прыехалі таксама іх бабулі і дзядулі: «Не раз чулі — самазбор, самазбор. Вось і вырашылі паспрабаваць. Хочам паболей назбіраць. Каб і паесці было, і намарозіць на зіму. Так атрымліваецца значна танней. Не ведаем, праўда, ці вытрымаюць тут дзеці больш як гадзіну...»

Сустрэла на ягаднай плантацыі і мінчан, для якіх самазбор ператварыўся ў сапраўдную традыцыю. Прыязджаюць сюды штогод па некалькі разоў з дзеткамі, бяруць з сабой сабачак. Для многіх гэта такая своеасаблівая прагулка, від сямейнага адпачынку. «Я на рынках ужо даўно ягады не купляю, бо гэта кот у мяшку, — кажа жанчына, якая прыехала разам з мужам і сынам-школьнікам. — Тут жа я хоць бачу, што збіраю». «А для мяне збор ягад — своеасаблівая медытацыя пасля гарадскога шуму. Тут свежае паветра, сонечна, спакойна, паслухайце, як птушкі заліваюцца на ўсе лады, — кажа жанчына гадоў 40 у ружовым капелюшы. — Я вось тут, зірніце, у кусціку з ягадамі знайшла гняздо, відаць дразды звілі. Кажуць, яны вельмі любяць ласавацца бружмелем».

Тыя людзі, якія тут не першы раз, прывезлі з сабой услончыкі, каб зручней было збіраць ягады, вяровачкі, каб не трымаць вядро ў руках. Мы падрыхтаваліся горш, але гэта, як я жартую, выдатная магчымасць праявіць вынаходлівасць: замест вяровачкі, у прыватнасці, мы выкарысталі матузкі, якія выцягнулі з красовак. І яшчэ: калі надумаецеся ехаць у Самахвалавічы збіраць ягады, раю надзець штаны і шкарпэткі, бо не ўсе ўчасткі яшчэ абкошаныя, можна ўлезці ў крапіву.

## Ад бружмелю да хенамелесу

Праз дзве гадзіны стомленыя, з сінімі рукамі і вуснамі, але загарэлыя і навітаміненыя, накіроўваемся да альтанкі, дзе **касір Вераніка СЯК** узважвае ягады. Нашы вядзерцы пацягнулі на два кілаграмы, заплацілі мы за іх 20 рублёў.

— Кошт у нас у параўнанні з той жа Камароўкай прыемны, — кажа Марына Пігуль. — На рынку за паўлітровы слоічак бружмелю вы заплаціце 12 рублёў. У нас жа кілаграм каштуе 10 рублёў. Гэта пакуль першыя ягады, потым цэны зменшацца. Плюс яшчэ ў тым, што ў нас тут ягадкі чыстыя, без усялякай хіміі, бо вы ж ведаеце, што можна зараз купіць на рынку, асабліва прывазное.

Людзі імкнуцца ў Самахвалавічы не толькі каб сэканоміць, але і каб мець выбар. Тут можна пакаштаваць усе ягады і збіраць толькі той сорт, што спадабаўся. У краме ж ці на рынку даводзіцца набываць тое, што ёсць. На ўчастку, дзе мы збіралі ягады, як я пасля даведалася, было больш за 30 сартоў бружмелю. Сярод іх і два беларускай селекцыі, выведзеныя ў Інстытуце пладаводства: «Зінри» і «Сінявокая». Усяго ж пад бружмель у Інстытуце пладаводства выдзелена больш за пяць гектараў зямлі, на якіх расце і вывучаецца каля ста розных сартоў гэтых ягад.

Марына Пігуль прызналася, што бружмель — яе самыя любімыя ягады.

— Яны суперкаштоўныя па сваім складзе — недарэмна іх называюць ягадамі жыцця, маладосці. Бружмель утрымлівае ў чатыры разы больш антыаксідантаў, чым чарніцы, а па колькасці вітаміну C не саступае лімону. Ёсць у гэтых цуда-ягадах і селен — «элемент маладосці», які рэдка сустракаецца ў жывой прыродзе. Ён абараняе нашу імунную сістэму, павышаючы супраціўляльнасць арганізма розным вірусам і бактэрыям. А ў саюзе з вітамінамі E і C запавольвае старэнне клетак. Больш за тое, гэтыя ягады не выклікаюць алергій, не павышаюць узровень цукру ў крыві, таму іх можна есці нават пры цукровым дыябеце. Таксама бружмель спрыяе нармалізацыі абмену рэчываў іціску, павышае ўзровень гемаглабіну. Праўда, для беларусаў гэтыя гаючыя ягады пакуль нязвыклыя. Але, думаю, гэта справа часу.

— Тым не менш сёння першы дзень самазбору, а людзі едуць і едуць... — заўважаю я.

— Ніколі яшчэ столькі людзей не было на бружмель. Звычайна ажыятаж на маліны, чарэшні, парэчкі... — кажа касір.

У Самахвалавічах, акрамя бружмелю, можна пазбіраць і іншыя сезонныя ягады.

— Неўзабаве паспеюць суніцы садовыя (ці клубніцы, як гэтыя ягады называюць у народзе), — расказвае Марына Пігуль. — Потым парэчкі (чырвоныя, чорныя, белыя), агрэст, маліны летнія (яшчэ ў нас ёсць рэмантантныя, але яны даюць ураджай пазней — восенню), абляпіха... Карацей, можна далучыцца да самазбору пачынаючы ад ранняга бружмелю і заканчваючы чарнаплоднай рабінай, глогам, хенамелесам японскім (айва), якія пладаносяць у кастрычніку. Наогул, у нас шырокі асартымент — усяго ад дзелам вырошчваем 29 ягадных культур.

— А буякі ці можна ў вас пазбіраць?

— Буякоў толькі сёлета пасадзілі паўгектара, будзем чакаць ураджаю некалькі гадоў.



Не падабаюцца высокія цэны на ягады — можна набыць танней у два разы. Але для гэтага збіраць іх прыйдзецца самастойна.

Прынамсі я ўбачыла толькі адзін мінус самазбору ў Самахвалавічах. Гэта тое, што прыехаць пазбіраць ягады можна толькі ў будні дні з 9.00 да 16.00. «Былі гады надта ўраджайныя на чорныя парэчкі, чарэшні, дык тады мы працавалі і ў суботу. Як будзе сёлета, не ведаю, паглядзім», — разводзіць рукамі касір Вераніка.

## У пошуках свайго фермера

Традыцыя самазбору даволі папулярная за мяжой. Напрыклад, мая сястра, якая жыве ў Амерыцы, месяц таму даслала здымкі пляменніка на клубнічным полі. Ездзяць сям'ёй да мясцовых фермераў збіраць клубніцы ўжо не першы год. Плацяць пяць долараў з чалавека за ўваход, атрымліваюць картонныя каробкі з ручкай. Спецыяльны трактарок вязе іх на вялізнае поле. Ніхто там на варэнне вёдрамі ягады не збірае, — кажа Наташа. — У асноўным людзі прыязджаюць дзеля забавы, паказаць гарадскім дзецям, як растуць клубніцы, паесці іх з градкі. Купляць назбіраныя ягады зусім неабвязкова. Іх з задавальненнем забяруць у краме, дзе, дарэчы, можна пакаштаваць і варэнне, і пасцілу, і выпечку з джэмам з сезонных ягад ці садавіны (там яшчэ ў сезон ладзяцца самазборы персікаў, яблыкаў). На тэрыторыі фермы ёсць драўляныя арэлі, каруселі, прадаюцца мяшочкі з камянямі, змяшанымі з пяском, якія можна прамываць у вадзе праз сіта. Дзецям гэта вельмі падабаецца. Чым не ідэя для нашых буйных фермераў, як з вырошчвання і збірання клубніц зрабіць бізнес-забаву.

**«Бружмель — першыя ягады, якія саспяваюць у Беларусі: сезон звычайна пачынаецца ў канцы мая — пачатку чэрвеня».**

Ведаю, што ў Чэхіі таксама людзі замест таго, каб набываць ягады на рынку, збіраюць іх на спецыяльных фермах. Ахвотных нямала, таму там нават стварылі спецыяльную клубнічную карту, дзе месцы самазбору абазначаюцца маленькімі клубнічкамі. І кожны можа выбраць найбліжэйшую да свайго месца пражывання ферму. Там можна набыць і ўжо сабраныя работнікамі ягады, але гэта будзе каштаваць удвая даражэй, чым пры самазборы.

У нас пакуль масавы самазбор фермеры не практыкуюць, у інтэрнэце я знайшла адзінкавыя аб'явы. Але ведаю ад знаёмых, што пры жаданні знайсці свайго фермера цалкам рэальна. Прынамсі, яны некалькі гадоў таму на рынку пазнаёміліся з жанчынай, якая прадавала маліны. Цяпер штогод ездзяць да яе на ўчастак збіраць ягады самі. Я таксама вырашыла пашукаць, дзе, акрамя Самахвалавіч, бліжэй да дому можна пазбіраць клубніц. У інтэрнэце трапіла на аб'яву фермера з Дзяржынскага раёна, які вырошчвае экалагічна чыстыя ягады і гародніну. Летась, у разгар клубнічнага сезона, ён прадаваў ягады па шэсць рублёў за кілаграм. Тых жа, хто хацеў купіць танней, запрашаў да сябе на клубнічнае поле са сваёй тарай. Пры ўмове ўласнаручнага збору кошт аўтаматычна зменшаўся ўдвая. «Прыязджалі людзі, якія збіралі хто 10, хто 15 кілаграмаў. І мне добра (не трэба наймаць людзей), і зборшчыкам. Якія-ніякія, а новыя ўражанні: збор ягады на прыродзе — чым не адпачынак! Цяпер жа не магу вам нічога абяцаць, патэлефануйце прыкладна праз тыдзень. З мінулай восені я не быў нават на полі, хварэў вельмі моцна. Толькі з бальніцы выпісаўся, пакуль вакол дома абкошваю, потым туды паеду». Я магла б, вядома, пашукаць іншага фермера, але мне вельмі хочацца падтрымаць менавіта гэтага. Таму абавязкова пазваню яму днямі.

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК,**
**фота аўтара.**

# ВАРШАЎСКАЕ АБВАСТРЭННЕ

## Чаму ўзрушыліся польскія ўлады?

**Прэм'ер-міністр Польшчы Матэвуш Маравецкі выступіў з чарговымі ваяўнічымі рэплікамі. Кіраўнік польскага ўрада прыняў удзел у адкрыцці пнеўматычнага спартыўнага ціра для школьнікаў горада Мышкува ў Сілезскім ваяводстве, паведаміла eadaily.com. Ён з'явіўся перад фотакамерамі з пнеўматычнай вінтоўкай нямецкай вытворчасці «Вальтар» і зрабіў палітычную заяву. «Крэмль павінен ведаць: калі Расія калі-небудзь задумае ўварвацца ў Польшчу, то ў нас ёсць 40 мільёнаў палякаў, гатовых са зброяй у руках абараніць сваю Радзіму», — заявіў кіраўнік польскага ўрада. Улічваючы, што насельніцтва Польшчы на 2018 год складала 38,4 мільёна чалавек, атрымліваецца, Маравецкі запісаў у Войска Польскае ўсіх без выключэння жыхароў краіны разам з дзецьмі, жанчынамі і старымі. У якасці матывацыі ваяваць «да апошняга паляка» прэм'ер згадаў фантомныя гістарычныя страхі. Пагадзіцеся, сітуацыя да болю нагадвае сцэнарыі, апісаныя ў падручніках па псіхіятрыі. Чаму ж так узрушыліся польскія ўлады, чым гэта пагражае?**

### АКТЫЎНАЯ ФАЗА

Характар і шчыльнасць навін з Варшавы ў дачыненні да Кіева сведчаць аб тым, што Польшча ўступіла ў актыўную фазу асваення Украіны. Пра гэта гаворыцца ў артыкуле расійскага палітолага, гісторыка Веранікі Крашанінніковай, апублікаваным на сайце агенцтва РІА «Навіны». Стала вядома, што са згоды Кіева палякі размяшчаюць у сябе рэзервовы цэнтр апрацоўкі даных Дзяржаўнай падатковай службы Украіны пад маркай «павышэння эфектыўнасці» ведамства. Служба знешняй разведкі Расіі заявіла, што Польшча спрабуе атрымаць кантроль над значнымі дзяржфункцыямі і ўстановамі ва Украіне, паведаміла ТАСС. Паводле звестак расійскай разведкі, Варшава ў сваіх планах перайшла да канкрэтных дзеянняў. У працэсе ўдзельнічае не толькі польскі бок, але і кампаніі з ЗША, такія як Dell, IBM і Cisco. «Інакш кажучы, Кіеў усвядомлена адкрывае польска-амерыканскаму тандэму доступ да звестак дзяржаўнай важнасці, уключаючы інфармацыю аб падаткаплацельшчыках і, як вынік, рэальным фінансавым стане Украіны», — заўважылі ў СЗР. Такімі дзеяннямі кіеўскія ўлады перадаюць суверэнітэт сваёй краіны ў чужыя рукі, лічаць у Службе знешняй разведкі.

Далей — больш. Прэзідэнт Польшчы Анджэй Дуда ў інтэрв'ю Bild заявіў, што Варшава перадала Кіеву зброю на два мільярды долараў, у тым ліку больш за 240 танкаў, амаль 100 адзінак бронетэхнікі і зброі, боепрыпасы і ракеты. Пасля Польшча анансавала найбуйнейшы кантракт: Украіна атрымае ўзбраенняў на 470 мільёнаў долараў, часткова аплачаных Еўрасаюзам, а грошы пойдуць на далейшае развіццё польскага ваенна-прамысловага комплексу, паведаміў Матэвуш Маравецкі.

Праўда, пасля Дуда з горыччу канстатаваў, што польскія рэзервы ўзбраенняў спустошаны з-за актыўных паставак Кіеву. Па яго словах, Польшча дагэтуль ніводнай краіне не пастаўляла ўзбраенні ў такім вялікім аб'ёме, у якім цяпер адпраўляе ва Украіну, паведаміла РІА «Навіны». У выніку Варшава сутыкнулася з сітуацыяй, калі яе ўласныя рэзервы вычарпаліся. Польскі лідар зазначыў, што краіна можа закупіць новае ўзбраенне, аднак гэта зойме нямала часу. Таму Варшава звярнулася да сваіх саюзнікаў на Захадзе з просьбай перадаць ёй былую ва ўжыванні тэхніку.

### У ЖОРСТКІЯ ЛАПЫ

У першыя дні чэрвеня пасол ЗША ў Польшчы Марк Бжэзінскі анансаваў будаўніцтва больш за сотні ваенных аб'ектаў у найбліжэйшыя дзесяць гадоў. Гэтую заяву амерыканскі дыпламат зрабіў разам з міністрам абароны Польшчы Марыушам Блашчаком (на той час кіраўнік абароннага ведамства, а цяпер віцэ-прэм'ер, які змяніў на гэтай пасадзе Яраслава Качыньскага) пры закладцы першага каменя для будаўніцтва склада ўзбраення ў Павідзе, дзе размешчана баявая батальённая група ЗША, — і гэты склад толькі першы з васьмі. Склады, натуральна, будуць запоўнены ўзбраеннямі. Такая канкрэтыка накладваецца на афіцыйныя заявы геастратэгічнага характару: у пачатку мая прэзідэнт Дуда абяцаў, што паміж Польшчай і Украінай не будзе граніц і яны будуць «адбудоўваць сумесна агульнае шчасце і агульную сілу».

«Польскі і ўкраінскі нацыяналізмы ў гісторыі рэгулярна сыходзіліся ў крывавых схватках — няўжо Зяленскі на гэты раз добраахвотна вядзе краіну ў жорсткія польскія лапы? Бо Зяленскі паўтараў Дуду ў прынцыповым пытанні: «Мы родныя. І паміж намі не павінна быць граніц ці бар'ераў. Украінскі і польскі народы ментальна межы даўно не падзяляюць». Ён заявіў гэта 22 мая разам з навінай аб тым, што МЗС Украіны распрацоўвае закон, які надасць палякам асаблівы статус і дазволіць займаць дзяржаўныя пасады. А незвычайна цёплыя абдымкі Зяленскага і Дуды ў парламенце толькі пацвярджаюць адсутнасць імкненняў да суверэнітэту», — лічыць Вераніка Крашанінннікава.

Чарговыя заявы прэзідэнта Польшчы Анджэя Дуды зусім недвухсэнсоўна сведчаць аб намеры Варшавы вярнуць сабе «ўсходнія крэсы» і захапіць заходнюю частку Украіны. Пра гэта ў сваім тэлеграм-канале напісаў былы дэпутат Вярхоўнай рады ад партыі «Апазіцыйная платформа — за жыццё» (АПЗЖ) Ілья Ківа. «Польшча актыўна працягвае падрыхтоўку да захопу Заходняй Украіны», — канстатаваў Ківа.

### ВЕРНЫ ВАСАЛ

Актыўна ствараюцца ўмовы для імклівай мілітарызацыі грамадства. Жыхары Польшчы павінны ведаць, як абыходзіцца са зброяй. Такое меркаванне ў эфіры «Радыё Польшча» выказаў Марыуш Блашчак, паведаміла ТАСС. «Я не сумняваюся, што як мага больш людзей павінны быць навучаныя, павінны ўмець карыстацца зброяй», — заявіў Блашчак. Цяпер у Польшчы разглядаецца новы законапраект, што спросціць атрыманне дазволаў на валоданне зброяй для палякаў, якія дасягнулі паўналецця і не маюць праблем з законам. Каментуючы дадзеную ініцыятыву, Блашчак адзначыў, што ў Польшчы ў цэлым трэба больш шырока навучаць людзей валоданню зброяй. Гэта можна зрабіць пры навучанні рэзервістаў, а таксама ў школах пры вывучэнні асноў ваеннай падрыхтоўкі.




У агульным «хоры» гучаць і ўвогуле шакавальныя заявы. Заходнія ўрады павінны забяспечыць Кіеў ядзерным узбраеннем для ўмацавання абаронных магчымасцяў краіны, лічыць колішні міністр замежных спраў Польшчы Радаслаў Сікорскі, які зараз з'яўляецца дэпутатам Еўрапарламента. Спікер расійскай Дзярждумы Вячаслаў Валодзін рэкамендаваў польскаму палітыку абследавацца ў псіхіятра. «Ён не думае пра будучыню ні Украіны, ні Польшчы. У выпадку рэалізацыі яго прапаноў гэтых краін не стане, зрэшты, як і Еўропы. Яму неабходна здаць мандат і сядзець дома пад наглядам», — напісаў Вячаслаў Валодзін у Telegram.

Польскія палітыкі не маюць сваіх поглядаў у пытаннях міжнароднай палітыкі. Такое меркаванне ў эфіры тэлеканала «Беларусь 1» выказаў польскі актывіст Марчын Міколаек. Па словах Міколаека, польскія ўлады мараць, каб Львоў вярнулі Польшчы: «Яны лічаць гэты ўкраінскі горад спрадвечна польскай тэрыторыяй. Улады Польшчы будуць толькі рады, калі «крэсы ўсходнія» вернуцца да іх». Ён таксама адзначыў, што Польшча лічыць сябе імперыяй, а па факце гэта маленькая краіна, якая зараз нічога не вырашае і выконвае загады ЗША».



Варшава як верны васал Вашынгтона паказвае, што з'яўляецца галоўнай апорай Злучаных Штатаў у Еўропе і спрабуе ўзяць рэванш за няўдачы ў мінулых стагоддзях, заявіў у інтэрв'ю РІА «Навіны» намеснік старшыні Савета бяспекі Расіі Дзмітрый Мядзведзеў. Ён дадаў, што цяперашнія польскія эліты прадстаўлены партыяй PiS, якая праводзіць на працягу апошніх дзесяці гадоў «курс праамерыканскі і абсалютна адмарожаны русафобскі».

### ГРОНКІ ГНЕВУ

Унутраная сітуацыя ў краіне абвастраецца. У Польшчы наспяваюць сацыяльныя пратэсты нечуванай сілы з-за краху эканомікі і росту сацыяльнай няроўнасці, заўважаў калумніст аўтарытэтнага выдання Myśl Polska Лукаш Ястржэмбскі. Спачатку ўрад тлумачыў крах эканомікі і бюджэтаў хатніх гаспадарак пандэміяй каранавіруса, пасля — правядзеннем Расіяй спецыяльнай ваеннай аперацыі ва Украіне. Аднак апошнім часам палякаў усё цяжэй пераканаць у тым, што ў іх праблемах вінаваты «Пуцін, Трамп або Папа Рымскі», падкрэслівае эксперт. Народ Польшчы ўсё менш упэўнены, што ўрад краіны ведае, што робіць. «Страх перад вайной змяняецца страхам перад дарагоўляй і галечай, — адзначыў Лукаш Ястржэмбскі. — Заканчваюцца зберажэнні і нервы. Усё гучней кажуць аб абмежаванні энергазабеспячэння і дэфіцыце на харчовым рынку».

Калумніст Myśl Polska адзначыў, што свядомасць палякаў «спее». Закрываюцца прадпрыемствы горнай і металургічнай прамысловасці, банкруцяцца сямейныя бізнесы. Над простымі грамадзянамі навісла перспектыва масавых звальненняў з-за страты працы. Многія з іх задыхаюцца ў крэдытах. Палякі ўсё больш недаверліва глядзяць на ўрад, справядліва мяркуючы, што яны не могуць нічога прапанаваць, акрамя лозунгаў. У грамадстве з-за незадаволенасці адбываецца радыкалізацыя. Людзі ўсё больш рэзка выказваюцца ў сваіх ацэнках. Іх ужо не заблытаць заклікамі да паказнога патрыятызму.

### ДЗЕД ДУДЫ ЎВАХОДЗІЎ ВА ЎКРАІНСКІ КАРНЫ БАТАЛЬЁН

Бесчалавечная ідэалогія польскіх улад мае адпаведныя карані. Напрыклад, стала вядома, што Генпракуратура Беларусі вывучае дзейнасць дзеда польскага прэзідэнта Анджэя Дуды, які ўваходзіў ва ўкраінскі карны батальён, што дзейнічаў у перыяд Вялікай Айчыннай вайны на беларускай тэрыторыі. Аб гэтым заявіў генеральны пракурор Андрэй Швед на пленарным пасяджэнні міжнароднай парламенцкай канферэнцыі «Гістарычная памяць: Вялікая Перамога, здабытая адзінствам» у Авальнай зале, паведаміла БелТА.

Паводле яго слоў, у многіх карных аперацыях бралі ўдзел латышскія і ўкраінскія паліцэйскія батальёны, якія адрозніваліся асаблівай жорсткасцю. «Імёны некаторых жывых злачынцаў нам вядомыя, і яны, карыстаючыся абаронай замежных дзяржаў, хаваюцца на іх тэрыторыі. Нягледзячы на гэта, мы будзем дабівацца іх прыцягнення да крымінальнай адказнасці. Цяпер мы маем інфармацыю аб месцах знаходжання не менш чым 400 такіх асоб».

Падчас расследавання крымінальнай справы Генпракуратура накіравала 60 просьбаў аб аказанні прававой дапамогі ў дачыненні да гэтых асоб у 18 дзяржаў, у тым ліку аб допытах і вытворчасці іншых следчых дзеянняў і іншых краінах», — заўважыў генпракурор. «Цяпер мы актыўна дакументуем дзейнасць дзеда польскага прэзідэнта Анджэя Дуды, які ўваходзіў у склад украінскага карнага батальёна, вызначыўся асаблівай жорсткасцю ў першую чаргу на тэрыторыі Мінскай і Віцебскай абласцей. І тэза аб генетычнай сувязі нацысцкіх злачынцаў і іх нашчадкаў пацвярджаецца бясспрэчнымі доказамі і фактамі», — адзначыў Андрэй Швед. Пагадзіцеся, дакладны дыягназ.

**Пётр ДУНЬКО.**




### Даслоўна

### «НЕЛЬГА ДАПУСЦІЦЬ, КАБ НАС ПАЛЯКІ АКРУЖЫЛІ»

Давядзецца адпаведным чынам рэагаваць на жаданне Польшчы атрымаць Заходнюю Украіну. Аб гэтым Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка заявіў падчас размовы з работнікамі ААТ «Белшына».

«Кіруюць англічане, амерыканцы праз палякаў у многім. Тыя ўсюды хочуць пастарацца і быць каля нагі гаспадара, і нешта ад гэтага атрымаць», — звярнуў увагу беларускі лідар. Кіраўнік дзяржавы заўважыў, што ў Польшчы ўжо мараць аб Заходняй Украіне: «Тут нам давядзецца рэагаваць. Таму што мы не можам дапусціць, каб нас наогул палякі акружылі. Гэта небяспечны варыянт. І я некалі сказаў: яшчэ ўкраінцы нас папросяць з расіянамі, каб мы ім дапамаглі захаваць цэласнасць. Каб не адсеклі».

Паводле слоў Прэзідэнта, гэта стала магчымым дзякуючы таму, што за спінай Польшчы стаяць амерыканцы, якія фінансуюць, даюць узбраенне, перакідваюць узброеныя сілы. «Мы гэта бачым. Таму мне даводзіцца і на захадзе трымаць узброеныя сілы напагатове, і на поўдні. Дзесяць падраздзяленняў выстраіў уздоўж граніцы за спінай у пагранічнікаў, каб не ўлезлі ў Беларусь. А такія думкі былі», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
23 ЧЭРВЕНЯ 2022 г.
ЧАЦВЕР
№ 10 (15933)
Выдаецца
з 21 красавіка 1921 года

Маладыя імёны

## Юлія МАЖЫЛОЎСКАЯ:

# «Найлепшая ўзнагарода для артыста — увага гледачоў»



**Яна студэнтка БДУ з 12-гадовым музычным вопытам. За спінай у дзяўчыны — мноства паспяховых канцэртаў і конкурсаў, вялікая колькасць узнагарод за прызавыя месцы. Мы пагаварылі з Юліяй аб яе знаёмстве з музыкай, выступленнях, першай песні і многім іншым.**

Цікавасць да музыкі з'явілася ў дзяўчыны ў першыя школьныя гады.

— Калі мае равеснікі пачалі наведваць развіццёвыя секцыі, я вырашыла, што таксама хачу паспрабаваць сябе. Спачатку абрала вакал і танцы. Праз пэўны час зразумела, што да заняткаў танцамі душа не ляжыць, і на замену ім прыйшла ігра на фартэпіяна. З таго моманту я стала сур'ёзна займацца ў гэтай сферы.

Нягледзячы на тое, што бацькі Юліі валодаюць музычнай адукацыяй, сама дзяўчына ніколі не наведвала спецыялізаваныя школы.

На сцэне наша суразмоўніца з васьмі гадоў. З гэтага ўзросту дзяўчына стала прымаць актыўны ўдзел у рэспубліканскіх вакальных конкурсах, займаючы прызавыя месцы. У 10 і 14 гадоў Юлія была фіналісткай нацыянальнага адбору песні для «Дзіцячага Еўрабачання». Таксама выступала на праекце «Новая хваля» ў Маскве.

Пазней конкурсная дзейнасць саступіла месца канцэртнай. Дзяўчына разам з артыстамі падарожнічала па гарадах краіны і выступала ў рамках праекта «Залатая калекцыя беларускай песні». Тры і чатыры гады таму Юлія выступала на «Славянскім базары».

Безумоўна, удзел у розных праектах і конкурсах патрабуе нямала часу. Па словах Юліі, сумяшчаць выступленні і вучобу ў школе не было праблемай.

— Нічога складанага, калі ты ўмееш размяркоўваць час і сілы.

Галоўнай цяжкасцю дзяўчына назвала сітуацыі, калі час канцэрта супадае з раскладам заняткаў.

За ўсе гады музычнай дзейнасці ў Юлі сабралася вялікая калекцыя прызоў. Але, як прызналася суразмоўніца, яны адыгрываюць для яе не галоўную ролю.

— Для любога артыста самая важная ўзнагарода — увага гледача. Калі яна ёсць, то ніякія кубкі і статуэткі не патрэбныя.

Дзяўчына распавяла, што са страхам сцэны ніколі не сутыкалася.

— Хваляванне заўсёды прысутнічае. Але калі выходзіш, забываеш пра гэта і выступаеш для сябе і гледачоў. Важна атрымліваць асалоду ад таго, што робіш, і не баяцца чужога меркавання.

Нягледзячы на моцную цікавасць да музыкі, пры выбары месца навучання Юлія аддала перавагу факультэту журналістыкі.

*(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)*

Прыёмная кампанія — 2022

# РАБОЧАЯ ПРАФЕСІЯ: ПЕРАЗАГРУЗКА

## У сістэме адукацыі няма тупіковых траекторый для моладзі

**15 чэрвеня ва ўстановах прафесійна-тэхнічнай адукацыі стартавала прыёмная кампанія. Яна будзе доўжыцца да 20 жніўня. Таму падаць дакументы ў прыёмную камісію, каб атрымаць рабочую спецыяльнасць, будзе не позна і пасля завяршэння прыёмнай кампаніі ў сярэдніх спецыяльных і вышэйшых навучальных установах.**

**У Міністэрстве адукацыі сцвярджаюць, што ў прафтэхустановы ідуць атрымліваць адукацыю самыя розныя катэгорыі выпускнікоў школ, у тым ліку і дастаткова паспяховыя, якія мелі ў школе добрыя адзнакі, часам нават медалісты.**



Фота Лізаветы ГОЛАД.

### У звязцы з заказчыкамі кадраў

— Моладзь пачынае разумець, што прафесійная адукацыя — гэта прэстыжна, цікава і перспектыўна. Штогод больш за трэць выпускнікоў школ працягваюць свой шлях ва ўстановах прафесійнай адукацыі. Іх выбар — гарантыя першага працоўнага месца, шырокія магчымасці для прафесійнага самаўдасканалення і асобаснага развіцця, для пабудовы паспяховай прафесійнай кар'еры, — падкрэслівае **першы намеснік міністра адукацыі Ірына СТАРАВОЙТАВА.**

У бягучым годзе прыём будуць весці 122 установы прафесійна-тэхнічнай адукацыі па больш чым 250 прафесіях. Акрамя таго, адукацыйныя праграмы па падрыхтоўцы рабочых рэалізуюць 43 установы адукацыі іншых узроўняў (каледжы, філіялы ВНУ). Сетка прафесійна-тэхнічных устаноў раўнамерна размеркаваная па ўсёй краіне. Яны ёсць у любой вобласці ў крокавай даступнасці і дазваляюць асвоіць актуальныя для канкрэтнага рэгіёна спецыяльнасці.

*(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)*

Даніна пашаны

# Моладзь для «Хатыні» — праваднік памяці

## У Год гістарычнай памяці гэта вельмі важна і сімвалічна

**У работах па рэканструкцыі мемарыяльнага комплексу «Хатынь» плануюць задзейнічаць каля 200 студэнтаў. Аб гэтым расказала камандзір Рэспубліканскага штаба студэнцкіх атрадаў БРСМ Надзея ШАХОЎСКАЯ.**



Фота БелТА.

«Ахвотных трапіць на Усебеларускую маладзёжную будоўлю ў «Хатыні» было шмат, аднак набор у нас абмежаваны. Работы на аб'екце будуць арганізаваны паэтапна, у тым ліку будуць і валанцёрскія заезды ў выхадныя. Першым прыступіў да работы студатрад БНТУ, паколькі гэты ўніверсітэт — флагман студатрадаўскага руху. Далей у рэканструкцыі прымуць удзел хлопцы і дзяўчаты з Лагойскага раёна, якія шмат разоў бывалі ў гэтым мемарыяльным комплексе. А пасля да работ прыступяць студэнты з Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. А. Куляшова. Далей па меры з'яўлення аб'ёмаў работ будуць падключацца і астатнія ахвотныя», — распавяла Надзея Шахоўская. Паводле яе слоў, хоць у работах плануюць задзейнічаць каля 200 студэнтаў, з улікам таго, што ў мемарыяльны комплекс хлопцы і дзяўчаты будуць прыязджаць амаль кожныя выхадныя, чалавека-гадзін і чалавека-дзён, на думку Надзеі Шахоўскай, будзе не менш за тысячу.

*(Заканчэнне на 3-й стар. «ЧЗ».)*

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
23 06 2022 г.

# РАБОЧАЯ ПРАФЕСІЯ: ПЕРАЗАГРУЗКА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

Сёлета на ўзровень прафесійна-тэхнічнай адукацыі плануюць прыняць больш як 26 тысяч чалавек. У структуры прыёму будуць захаваны тэндэнцыі мінулых гадоў: спецыяльнасці рэальнага сектара эканомікі складуць каля 74 працэнтаў. Усе ўстановы прафтэхадукацыі працуюць у вельмі шчыльнай звязцы з арганізацыямі — заказчыкамі кадраў і аператыўна рэагуюць на патрэбы рынку працы. Таму прыём па адных спецыяльнасцях прыпыняецца, а па іншых, наадварот, адкрываецца. Напрыклад, сёлета распачнецца падрыхтоўка па 141 новай для асобных навучальных устаноў прафесіі і прыпыніцца падрыхтоўка па 132 прафесіях і спецыяльнасцях. Але гэта не азначае, што прыёму па гэтых спецыяльнасцях не будзе ў іншым рэгіёне.

Напрыклад, Мінскі дзяржаўны прафесійна-тэхнічны каледж дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва імя Кедышкі адкрывае на базе дзевяці класаў набор на новую спецыяльнасць — «Тэхналогія апрацоўкі металаў ціскам». Залічэнне будзе праводзіцца на падставе конкурсу сярэдняга бала дакумента аб адукацыі. За тры гады навучэнцы атрымаюць адразу тры кваліфікацыі: «Каваль ручнога кавання» (трэцяга разраду), «Каваль-штампоўшчык» (трэцяга разраду) і «Электрагазазваршчык» (трэцяга разраду). У цяперашні час усяго тры ўстановы адукацыі ў краіне рыхтуюць кавалёў. А з гэтага года да іх далучыцца яшчэ і каледж дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва імя Кедышкі.

> **«Рукамі сёння можна зарабіць нават больш, чым галавой, прафесіяналы — нарасхват».**

У Гродзенскім дзяржаўным прафесійна-тэхнічным каледжы камунальнай гаспадаркі сёлета ўпершыню будзе весціся падрыхтоўка навучэнцаў па кваліфікацыі «Слесар па зборцы металаканструкцый», у Лідскім дзяржаўным прафесійным політэхнічным ліцэі — па кваліфікацыях «Аператар станкоў з праграмным кіраваннем», «Станочнік шырокага профілю». У Гродзенскім электратэхнічным каледжы адкрываецца набор на новую спецыяльнасць «Сацыяльная работа» з прысваеннем рабочай кваліфікацыі «Сацыяльны работнік». Навагрудскі сельскагаспадарчы прафесійны ліцэй пачынае падрыхтоўку па прафесіі машыніст крана аўтамабільнага ў інтэграцыі са спецыяльнасцю «Электрагазазваршчык».

## Сацыяльны пакет — моцны аргумент

У Мінскай вобласці ў бягучым годзе плануецца прыняць на ўзровень прафесійна-тэхнічнай адукацыі 3054 навучэнцы.

«Апошнія гады ўсе выпускнікі нашых устаноў прафесійнай адукацыі былі забяспечаны першым працоўным месцам, — падкрэслівае **начальнік галоўнага ўпраўлення па адукацыі Мінскага аблвыканкама Мікалай БАШКО.** — Гэта вельмі важна, таму што гарантаванае працаўладкаванне — пэўная падушка бяспекі для маладога чалавека. Мінская вобласць у інвестыцыйным плане вельмі прывабная, а рабочыя прафесіі для яе надзвычай важныя. Штогод мы аналізуем вынікі ўступнай кампаніі, вывучаем патрэбы рынку працы, мяняем падыходы па адкрыцці новых спецыяльнасцяў. Разумеем, што параўноўваць колькасць хлопцаў, якія паступілі на спецыяльнасць «Трактарыст», сёння і 20 гадоў таму, няправільна. Хоць бы таму, што тэхніка і ўмовы працы змяніліся, і такой колькасці трактарыстаў, як раней, ужо не патрабуецца.

**Дырэктар Мінскага дзяржаўнага абласнога каледжа Вадзім ДОРДАЛЬ** упэўнены, што за рабочымі прафесіямі — будучыня, яны будуць заўсёды, без іх — нікуды.

«Летась у выніку прафарыентацыі на 190 месцаў у нас было пададзена больш за 400 заяў. Конкурс у каледж быў даволі высокі. Мы бачым, як развіваюцца тэхналогіі і тэхналагічнае абсталяванне. Сёння рабочы чалавек — гэта зусім не той рабочы, што быў 10–20 гадоў таму. Ад яго патрабуюцца зусім іншыя веды. Напрыклад, адна з рабочых прафесій — аператар лініі ў вытворчасці харчовай прадукцыі. Калі раней на лініі стаяла па 40—50 чалавек, то цяпер яе абслугоўваюць 4-5. Тут ужо патрабуюцца камп'ютарныя, тэхнічныя, тэхналагічныя веды зусім іншага ўзроўню», — кажа дырэктар.

Вадзім Дордаль лічыць, што навучэнцам і іх бацькам трэба тлумачыць, што рабочая прафесія дае шмат перавагаў. Нават калі ты потым па скарочанай праграме паступіш у вышэйшую навучальную ўстанову і зоймеш кіруючую пасаду, то будзеш ведаць сітуацыю знутры. «Да нас паступаюць дзеці з высокімі баламі. Яны не саромеюцца рабочай прафесіі. У гэтым годзе я выпускаю групу ў 29 чалавек, 20 з якіх заканчваюць каледж з чырвонымі дыпломамі. Пры гэтым 16 з іх паступалі да нас медалістамі. Мы ганарымся, што дзеці ідуць у прафесію свядома. Немалаважны момант у замацаванні на першым працоўным месцы мае і сацыяльны пакет, які пасля заканчэння навучальнай установы прапануюць прадпрыемствы нашым выпускнікам. Па-першае, гэта частковая аплата здымнай кватэры або выдзяленне жылля, большасць прадпрыемстваў мена віта так і робяць. Па-другое, заработная плата, потым умовы працы плюс добразычлівая атмасфера ў працоўным калектыве... Калі маладому чалавеку камфортна, ён адпрацуе на прадпрыемстве па размеркаванні і застанецца працаваць там далей», — кажа Вадзім Дордаль.

## Спецыялісты ў «сухім будаўніцтве»

Мінскі дзяржаўны прафесійны ліцэй № 12 з'яўляецца базавай пляцоўкай па падрыхтоўцы нацыянальнай каманды да WorldSkills па кампетэнцыі «Абліцоўка пліткай». Для гэтага тут ёсць матэрыяльна-тэхнічная база, абсталяваныя плошчы, патрэбныя матэрыялы і, галоўнае, кадры. **Намеснік дырэктара ліцэя па вытворчым навучанні Ігар УДАВЕНКА** з'яўляецца міжнародным экспертам па гэтай кампетэнцыі, не адзін год рыхтуе ўдзельнікаў і пераможцаў конкурсаў прафесійнага майстэрства. З 2013 года ў ліцэі функцыянуе рэсурсны цэнтр па кваліфікацыі «Аздабленчыя будаўнічыя работы».

— Тры гады таму мы разам з кампаніяй Knauf адкрылі новую спецыяльнасць «Мантажнік каркасна-абшывачных канструкцый сухога будаўніцтва». І калі першы год у нас былі праблемы з наборам навучэнцаў, бо не ўсе разабраліся, наколькі перспектыўная гэта спецыяльнасць, то цяпер вельмі добра працуе сарафаннае радыё і праблем з камплектаваннем няма, — расказвае Ігар Удавенка. — За апошнія гады ў будаўніцтве няўхільна павялічваюцца аб'ёмы прымянення «сухіх» будаўнічых матэрыялаў, якія дазваляюць вырашаць на прафесійным узроўні самыя разнастайныя задачы: гэта планіроўка і арганізацыя ўнутранай прасторы будынкаў, дызайн, акустыка, гука- і цеплаізаляцыя памяшканняў, аздабленне і ўцяпленне фасадаў, даху і інш. Мантажнік каркасна-абшываных канструкцый сухога будаўніцтва — спецыяліст з адпаведнай падрыхтоўкай і кваліфікацыяй у галіне «сухога» способу будаўніцтва. Дарэчы, на апошнім Рэспубліканскім конкурсе прафесійнага майстэрства «WorldSkills Belarus 2020» навучэнец ліцэя Яўген Бакавец заняў першае месца па кампетэнцыі «Сухое будаўніцтва і тынкавальныя работы». Таксама мы — адзіная прафесійна-тэхнічная ўстанова адукацыі ў Мінску, дзе рыхтуюць спецыялістаў па ўкладцы паркету. На базе ліцэя адкрыты першы і адзіны ў Беларусі цэнтр навучання па кваліфікацыі «Укладчык падлогавых пакрыццяў».

Увогуле, у ліцэі склалася вельмі плённае сацыяльнае партнёрства з айчыннымі і замежнымі кампаніямі, вытворцамі будаўнічых матэрыялаў. Яны выдзяляюць сродкі на набыццё матэрыялаў, з якімі працуюць нашы навучэнцы ў майстэрнях. Прымаючы ўдзел у арганізацыі адукацыйнага працэсу, вытворцы вучаць працаваць з новымі тэхналогіямі і прасоўваюць сваю прадукцыю на беларускім рынку, а ўстанова адукацыі ўдасканальвае матэрыяльна-тэхнічную базу і рыхтуе спецыялістаў, якія маюць навыкі работы з інавацыйнымі матэрыяламі.

За апошнія тры гады агульная колькасць заявак на падрыхтоўку спецыялістаў, згодна з заключанымі дагаворамі аб узаемадзеянні ліцэя з арганізацыямі-заказчыкамі, узрасла больш як удвая. Штогод ад базавых арганізацый у адрас установы адукацыі прыходзяць падзячныя лісты па выніках праходжання навучэнцамі вытворчай практыкі. Многія з навучэнцаў працягваюць свой працоўны шлях на прадпрыемствах, дзе яны праходзілі вытворчае навучанне. Ігар Удавенка заўважае, што рукамі сёння можна зарабіць нават больш, чым галавой, прафесіяналы — нарасхват.



## Хто ён, сучасны рабочы?

— Рабочыя спецыяльнасці заўсёды будуць запатрабаванымі ва ўсіх сферах. Нават пры навучанні ў ВНУ сучасны студэнт тэхнічнага профілю імкнецца атрымаць паралельна яшчэ і рабочую спецыяльнасць. Бо, каб стаць добрым інжынерам, трэба валодаць навыкамі эксплуатацыі абсталявання, разумець спецыфіку і структуру прамысловых працэсаў, — падкрэслівае Ірына Старавойтава. — Спецыялісты, якія спачатку навучаліся ў прафесійна-тэхнічнай установе, затым — у сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай, сёння самыя запатрабаваныя і паспяховыя. Менавіта ім работадаўцы аддаюць перавагу пры правядзенні конкурсу на пасаду, ім даваяраюць найбольш складаную, адказную працу, з імі раяцца. І ўсё таму, што яны добра ведаюць увесь працэс вытворчасці не толькі тэарэтычна, але і практычна.

— Сучасныя тэндэнцыі сведчаць, што праца будзе станавіцца ўсё больш высокатэхналагічнай, — кажа **рэктар Рэспубліканскага інстытута прафесійнай адукацыі Валерый ГАЛУБОЎСКІ.** — Адукацыйнае асяроддзе ў нашых навучальных установах дазваляе навучэнцам асвоіць кампетэнцыі, запатрабаваныя не толькі сёння, але і найбольш перспектыўныя, аб якіх перадавыя прадпрыемствы толькі задумваюцца. Яны, дарэчы, хутка падхопліваюць такіх выпускнікоў. Сучасны рабочы — гэта эрудзіраваны, высокакваліфікаваны спецыяліст, які, акрамя прафесійных ведаў, павінен валодаць спецыфічнымі навыкамі ў сумежных галінах, у тым ліку разбірацца ў інфармацыйных тэхналогіях, робататэхніцы і г. д. Мяжа паміж рабочым і інжынерам усё больш размываецца.

> **«Навучэнцам і іх бацькам трэба тлумачыць, што рабочая прафесія дае шмат пераваг».**

Сёння ў сістэме адукацыі няма тупіковых траекторый для моладзі. Калі сям'я стаіць перад выбарам, ці варта ісці дзіцяці пасля дзевяці класаў у сістэму прафесійна-тэхнічнай або сярэдняй спецыяльнай адукацыі, то хачу запэўніць, што пасля завяршэння навучання перад выпускніком адкрыты ўсе дарогі для прырошчвання сваіх кампетэнцый. Выпускнікі 11-х класаў усяго пасля аднаго года навучання ў ПТВ могуць прэтэндаваць на скарочанае навучанне на ўзроўні сярэдняй спецыяльнай адукацыі. А далей для іх адкрыты шырокі спектр адпаведных спецыяльнасцяў у ВНУ, дзе можна навучацца ў вочнай і завочнай форме. Маладым людзям, якія стаяць перад прафесійным выбарам, трэба прыслухацца да сябе і адказаць на пытанні. Хто я: даследчык або хачу быць, напрыклад, спецыялістам па рамонце электрамабіляў? Падумайце, наколькі цікава вам будзе развівацца ў абранай сферы. Хачу падкрэсліць, што патрэба ў прадстаўніках рабочых прафесій і спецыялістах сярэдняга звяна пастаянна нарастае. А стэрэатып, што прафесійна-тэхнічная адукацыя — толькі для няўдачнікаў, сёння не актуальны».

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
**Фота Лізаветы ГОЛАД.**

## Будзь у курсе!

У рамках праекта «Занятасць, прафесійная адукацыя і навучанне ў Беларусі» супрацоўнікамі Рэспубліканскага інстытута прафесійнай адукацыі быў распрацаваны комплекс анлайн-методык «Профітэст».

Тэсты арыентаваны на старшакласнікаў і маладых людзей, якія стаяць перад выбарам будучай прафесіі. Методыкамі могуць скарыстацца і дарослыя, якія задумваюцца аб змене прафесіі і роду сваёй дзейнасці. У прыватнасці, тэст «Прафесія для цябе» дапаможа вызначыць сферу дзейнасці і прафесію, якая адпавядае тыпу асобы дарослага чалавека, у якіх ён мае ўсе шанцы дабіцца прафесійнага поспеху.

Прафарыентацыйныя тэсты дазваляюць ацаніць прафесійныя інтарэсы і схільнасці, матывы выбару прафесіі, вызначыць прафесійна-асобасныя асаблівасці, важныя для пэўнай прафесійнай дзейнасці, і пабудаваць індывідуальную адукацыйную траекторыю.

Знайсці тэсты можна на інтэрнэт-рэсурсе https://profitest.ripo.by.

# Моладзь для «Хатыні» — праваднік памяці

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

«Мы рэканструіравалі «Хатынь» 20 гадоў таму, і тады БРСМ атрымаў падзяку ад кіраўніка дзяржавы. Цяпер прыйшло наступнае пакаленне, якое таксама будзе выконваць такія работы. Гэта вельмі важна і сімвалічна, паколькі моладзь стане праваднікам тых каштоўнасцяў і той памяці, якую захоўвае гэтае месца», — сказала камандзір Рэспубліканскага штаба студэнцкіх атрадаў.

Студэнцкі будаўнічы атрад «Мінск-955» імя Героя Савецкага Саюза Івана Ільіча Кустава пачаў 14 чэрвеня работы на аб'ектах капітальнага рамонту і рэканструкцыі Дзяржаўнага мемарыяльнага комплексу «Хатынь», якому Указам № 176 Прэзідэнта Беларусі ад 13 мая 2022 года прысвоены статус Усебеларускай маладзёжнай будоўлі. Першы студэнцкі будаўнічы атрад для работы на знакавым гістарычным аб'екце — рэканструкцыі мемарыяла «Могілкі вёсак» у мемарыяльным комплексе «Хатынь» — сфарміраваны на базе штаба працоўных спраў БРСМ Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта ў складзе дзесяць чалавек.

Прыняць удзел ва Усебеларускай маладзёжнай будоўлі могуць юнакі і дзяўчаты ва ўзросце ад 14 да 31 года, у тым ліку ў складзе студэнцкіх атрадаў. Гэта дазволіць аб'яднаць іх грамадзянска-патрыятычнай ідэяй, будзе садзейнічаць павышэнню сацыяльнай актыўнасці моладзі, а таксама папулярызацыі і развіццю студатрадаўскага руху.

Паміж ЦК БРСМ і Дзяржаўным мемарыяльным комплексам «Хатынь» заключаны мемарандум аб супрацоўніцтве. Яго мэта — узаемадзеянне бакоў па папулярызацыі грамадзянскіх каштоўнасцяў, патрыятычным і духоўна-маральным выхаванні моладзі праз гістарычную памяць, арганізацыю вольнага часу моладзі, уцягванне юнакоў і дзяўчат у сацыяльныя валанцёрскія праекты.

Запіс у студэнцкія атрады яшчэ ідзе. Зусім хутка будуць стартаваць адзін за адным рэспубліканскія працоўныя праекты. Сярод іх, акрамя «Хатыні», — маладзёжная будоўля «БелАЭС». Таксама ў юнакоў і дзяўчат будзе магчымасць папрацаваць на такіх буйных прадпрыемствах, як «МАЗ» і «Атлант». Акрамя гэтага, плануюцца выезды ў Расійскую Федэрацыю на міжнародныя і ўсерасійскія студэнцкія будоўлі.



Фота БелТА.

Каб трапіць у студатрады, хлопцам і дзяўчатам трэба здаць сесію, азнаёміцца з асновамі працоўнага заканадаўства, а самае галоўнае — мець жаданне працаваць. Акрамя таго, пажадана валодаць добрым здароўем, паколькі праца патрабуе немалых фізічных намаганняў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

*Камертон настрою*

# НЕЗВЫЧАЙНАЕ ХОБІ КІТАЙСКАГА СТУДЭНТА

«Пра беларускіх пісьменнікаў павінны даведацца ў Кітаі», — лічыць пяцікурснік факультэта радыёфізікі і камп'ютарных тэхналогій БДУ Сунь Фаньцы

**Ён паставіў перад сабой мэту — пазнаёміць кітайскіх чытачоў са спадчынай беларускай літаратуры. Фаньцы пераклаў з рускай мовы на кітайскую аповесць Уладзіміра Караткевіча «Дзікае паляванне караля Стаха». Карпатлівая праца заняла паўтара года. Пераклад твора беларускага аўтара апублікаваны ў пяці нумарах часопіса «Belarus», якія выходзяць у Кітаі.**



Фота прэс-службы БДУ.

Па словах хлопца, аповесць падыходзіць для азнаямлення з беларускай культурай і традыцыямі. Перакладам студэнт БДУ займаўся ў вольны ад вучобы час. Прызнаецца, што яму не заўсёды хапала ведаў па рускай мове, асабліва калі траплялiся састарэлыя выразы. Тады на дапамогу прыходзілі даведнікі, слоўнікі і рускамоўныя сябры. На шчасце, за гады, праведзеныя ў Беларусі, іх у Фаньцы з'явілася нямала.

На пытанне, чаму для перакладу абраў менавіта Уладзіміра Караткевіча, Фаньцы прызнаецца, што ўпершыню прачытаў беларускага аўтара па парадзе знаёмых. «Мне вельмі спадабалася перапляценне прыгодніцкага жанру з містыкай. У Кітаі шмат кніг, перакладзеных з іншых моў, але зусім мала твораў пісьменнікаў з Беларусі. Лічу, яны вартыя таго, каб пра іх даведаліся ў розных кутках зямлі», — разважае Фаньцы.

Займацца перакладам прафесійна не ўваходзіць у планы хлопца. «Я абраў прафесію па прызванні, — кажа ён, — а пераклады разглядаю ў якасці хобі, якое прыносіць мне задавальненне. Буду вельмі рады, калі дзякуючы гэтаму беларуская літаратура стане папулярнай у Кітаі».

Дарэчы, аповесць Караткевіча — не першы твор, які малады чалавек пераклаў на кітайскую мову. Таксама ён займаўся перакладам кнігі Алеся Карлюкевіча «Шуршун і яго сябры», казкі «Шчаслівая кніга» Кацярыны Хадасевіч-Лісавой і казкі Людмілы Рублеўскай «Пік-Пік і Пепіта на паляванні».

Зусім хутка малады чалавек атрымае дыплом БДУ і пачне працаваць па спецыяльнасці. Акрамя таго, Фаньцы задумваецца аб перакладзе рамана Караткевіча «Чорны замак Альшанскі». Таленавітага юнака не палохаюць складанасці, ён upэўнены... 

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

*Рух ад сэрца*

# БЯЗДОМНЫМІ НЕ НАРАДЖАЮЦЦА,

## або Калі для шчасця патрэбна толькі любоў

**Ці часта вы заўважаеце бадзяжных жывёл? Стомленыя, галодныя, яны ходзяць па вуліцах і з асцярогай назіраюць за мінакамі. Некаторыя праводзяць так усё сваё жыццё і там жа, на вуліцы, паміраюць. Але бывае і так, што кагосьці забіраюць арганізацыі, якія займаюцца бяздомнымі жывёламі, а кагосьці — неабыякавыя людзі. Аднак лёс кожнага безнагляднага чатырохнагага знаходзіцца ў нашых руках.**

З праблемай бадзяжных жывёл мне давялося пэўны час таму сутыкнуцца і самой. Неяк у выхадны дзень бацька вяртаўся ў Мінск. Спыніўшыся ў лесе, ён пачуў слабае мяўканне, якое даносілася з травы. Падышоўшы бліжэй, заўважыў на зямлі двух маленькіх белых кацянят з неверагодными блакітнымі вачыма. Яны былі худыя і вельмі напалоханыя. Магчыма, гаспадар вырашыў пазбавіцца ад жывёл, пакінуўшы іх на гібель у лесе. Бацька пашкадаваў кацянят і забраў іх з сабой. У машыне яны пачалі гуляць, бегалі па сядзеннях.

Прыехаўшы дадому, бацька пасадзіў жывёл на падлогу. На гэты раз тыя баяліся паварушыцца і пастаянна мяўкалі. Мама адразу ж прынесла малако, пасля чаго кацянят памылі. Ужо праз гадзіну яны гулялі і не баяліся сядзець на руках.

На наступны дзень я паехала з жывёламі да ветэрынара. Лекар агледзела кацянят і сказала, што «дзяўчынкам» патрэбна добрае ўтрыманне: іх маса цела была недастатковай для нормы, вочы слязіліся, даймалі кляшчы і іншыя паразіты. Таксама абедзве кошачкі не чулі. У канцы прыёму ветэрынар пацікавілася: «Будзеце шукаць ім новы дом?» Але думак аб тым, каб аддаць іх, у мяне не было. У той жа дзень я набыла ўсе патрэбныя лекі і пачала догляд новых членаў нашай сям'і.

Кацяняты падрасталі, іх здароўе паляпшалася. Але раптам адна жывёла занядужала, мала рухалася і амаль не гуляла. Візіт да ветэрынара вырашылі не адкладаць. На прыёме лекар сказаў, што ў кацяняці сур'ёзны вірус, і, калі не вырашыць праблему адразу, жывёла загіне... Працэс лячэння праходзіў цяжка. Кожны ўкол і кожны прыём лекаў выклікаў гучнае мяўканне. Нягледзячы на ўсё гэта, кацяня змагло паправіцца. З часам у адной з гадаванак нават з'явіўся слых.

Зараз жывёлы вельмі актыўныя, любяць спаць на сонцы і ласкава паводзяць сябе з гаспадарамі.

Каб лепш разабрацца ў пытанні беспрытульных гадаванцаў, мы пагутарылі з **Тамарай Уладзіміраўнай ЦАРЫКОЎСКАЙ, дырэктарам месца часовага ўтрымання жывёл «Фаўна горада», і Вольгай Аляксандраўнай КАРПАВАЙ, старшынёй праўлення Міжнароднага дабрачыннага грамадскага аб'яднання дапамогі жывёлам «ЗААшанц».**

— Большасць бяздомных жывёл не нараджаецца на вуліцы, у тым ці іншым пакаленні гэта выкінутыя жывёлы, вынік адсутнасці кантролю за нараджальнасцю, — мяркуе Вольга Аляксандраўна.

Знаходзячыся без нагляду на вуліцы, каты ці сабакі могуць быць небяспечныя для саміх сябе і для навакольных. Як жа паступіць у такім выпадку? Правільным рашэннем будзе звярнуцца ў жыллёвую службу або самастойна звязацца з арганізацыяй, якая дапамагае бадзяжным жывёлам.

Тамара Уладзіміраўна апісала, як утрымліваюцца гадаванцы ў іх:

— Каты жывуць у некалькіх дзясятках клетак, у кожнай з іх можа знаходзіцца як тры-чатыры, так і больш жывёл. Мы размяркоўваем іх такім чынам, каб сумеснае пражыванне праходзіла мірна. З-за таго, што катоў цяпер вельмі шмат, ім выдзелены дадатковы пакой. Для сабак, акрамя вальераў, ёсць два пакоі: адзін — для шчанюкоў, іншы — для тых, хто перанёс аперацыю.

Жывёлы паступаюць у падобныя арганізацыі ў розных станах: без лапак, з ранамі, крываўцёкамі. Пасля прыбыцця кожны чацвераногі трапляе на прыём да ветэрынара. Вольга Аляксандраўна расказвае:

— Прыкладна 90 працэнтаў нашых выдаткаў складаюць паслугі ветэрынарных клінік. Мы супрацоўнічаем з імі па ўсёй Беларусі. Асноўныя працэдуры — кастрацыя, стэрылізацыя і вакцынацыя жывёл. Калі параўноўваць лячэнне з утрыманнем, то апошняе абыходзіцца нядорага.

На жаль, не ўсе праблемы са здароўем можна вырашыць. Гэта адна з прычын, па якіх жывёл з «недахопамі» бяруць радзей за астатніх, і калі адны знаходзяцца ў арганізацыях некалькі дзён, то іншыя — некалькі гадоў. Некаторыя паміраюць ад старасці, так і не знайшоўшы сабе гаспадароў. З кожным годам шукаць новых уладальнікаў для жывёл становіцца ўсё складаней. Акрамя тых, хто так і не знайшоў сабе дом, маюцца гадаванцы, якія нядоўга знаходзіліся ў новай сям'і.

— Прычыны, па якіх людзі вяртаюць жывёл, розныя. Часцей за ўсё адмова тлумачыцца алергіяй. Але некаторыя вяртаюць таму, што жывёла не паводзіць сябе як цацка, — тлумачыць Вольга Аляксандраўна.



Пошук гаспадароў нялёгкі, але некаторыя жывёлы ўсё ж знаходзяць сям'ю.

Вольга Аляксандраўна распавядае: на працягу дня ў іх арганізацыю паступае каля 150 просьбаў аб дапамозе, і за ўвесь час даводзілася працаваць з многімі жывёламі. Сустракаліся трусы, чарапахі, коні, быў нават казёл. Але частыя госці ўсё ж каты і сабакі. Апошнім нярэдка патрабуецца дрэсіроўка і работа з кінолагамі.

...Кожны з нас у стане дапамагчы беспрытульным чацвераногім. Для гэтага можна самастойна паспрабаваць знайсці ім дом ці ахвяраваць корм і лекі арганізацыям, якія займаюцца бяздомнымі жывёламі. А можна проста зрабіць іх жыццё часцінкай свайго.

**Лізавета МАЛЬЧУК, студэнтка III курса факультэта журналістыкі БДУ.**

**Фота аўтара.**

SEX-БАЛЯСЫ

# СУМЛЕННА-ХІТРЫЯ ГРОШЫ

**Як ужо пісалі раней СМІ, у сталіцы набірае абароты новы від махлярства: у міліцыю пачасціліся звароты грамадзян, якія сталі ахвярамі зламыснікаў, што прапануюць інтым-паслугі. («Шукаю разумную, прыгожую, дагледжаную, клапатлівую дзяўчыну для стварэння сур'ёзных адносін. Па чацвяргах».) Схема такая: апошнія рэгістравалі ў сацсетках фэйкавую старонку і ад імя неіснуючай дзяўчыны прапаноўвалі платныя ўцехі. Калі патэнцыяльны кліент пагаджаўся на прапанаваныя ўмовы, ад яго ў якасці гарантыі патрабавалі перадаплату. («Калі дзяўчына сыходзіць ад цябе па ўласным жаданні, яна павінна адпрацаваць яшчэ два тыдні, пакуль не знойдзеш нову».) У некаторых выпадках пасля пераводу сродкаў стасункі з заказчыкам спыняліся, у іншых працягвалася выманьванне грошай быццам бы для аплаты арэнды кватэры, паслуг таксі. («— Розачка, дарагая, выходзьце за мяне замуж!» — «А пярсцёнак з вялізарным брыльянтам падорыце?» — «Спрытна вы мяне адшылі, спрытна...») Ну, гэта спрэс крымінал. Між іншым прыгадаем знакамітага Астапа Бендэра з яго чатырохстамі адносна сумленнымі спосабамі прыдбання грошай. («Мужчыны не крыўдзяцца — мужчыны перастаюць кідаць смешныя карцінкі з коцікамі ў асабістых паведамленнях».)**

Так, дзяўчына з Вялікабрытаніі Макол Брок прызналася ў сацсетках, што ў студэнцкія гады з-за адсутнасці сродкаў 16 дзён запар хадзіла на спатканні, толькі каб як след паесці, бо заўсёды плацілі мужчыны. («Якая я ў мяне разумнічка».) Гэтыя словы зрабілі сапраўдны фурор у інтэрнэце, яна сабрала 1,5 мільёна праглядаў і выклікала гарачую дыскусію: Брук паступіла разумна ці бессаромна выкарыстала візаві? («Дзяўчыну напачатку запрашаюць у кіно, каб зразумець, ці зможа яна спакойна выседзець хоць бы паўтары гадзіны».) «У каледжы, калі ў мяне скончыліся грошы на ежу, я зайшла ў дадатак для знаёмстваў і на працягу 16 дзён кожны дзень хадзіла на спатканні ў рэстараны. Дзяўчына павінна есці», — напісала яна. («Я настолькі няспешчаная баба, што, калі аднойчы муж прапанаваў мне каву ў ложак, я разрыдалася. Ну як прапанаваў... Крыкнуў з кухні: «Каву будзеш?»)



Многія карыстальнікі сеткі былі ашаломленыя прастатой ідэі Макол па атрыманні бясплатнай ежы такім чынам. («Вырашыў перагледзець свае погляды. Зноў усё спадабалася».) Адзін з карыстальнікаў пракаментаваў: «Цалкам дзелавое рашэнне». Іншы пахваліў дзяўчыну, заявіўшы: «Гэта ўніверсальны лайфхак». «Ты геній!» — напісала яшчэ адна карыстальніца. («Жанчыне, каб атрымаць бальнічны, дастаткова прыйсці да ўрача ненафарбаванай».) Аднак не ўсе падтрымалі рашэнне Макол пайсці на спатканне, каб атрымаць аплату за вячэру. Асабліва незадаволены былі, вядома, мужчыны. Адзін з іх абурана заявіў: «Таму я ніколі не плачу за іх на спатканнях». («— Вунь, глядзі, зорка падае! Загадай жаданне!» — «Я хачу, каб ты на мне ажаніўся!» — «Вой, глядзі, назад паляцела...»)

А японскі «гультай» разбагацеў, нічога не робячы. 37-гадовы Седзі Марымота з Краіны ўзыходзячага сонца праславіўся ў сетцы, зарабляючы сабе на жыццё незвычайным спосабам. («Аб'ява: «Мужчына, вельмі паспяховы, разумны, незалежны, мэтанакіраваны, пазнаёміцца з дзяўчынай, тата якой возьме яго на працу».) Жыхар Токіа жанаты, мае ступень па фізіцы. Але замест таго, каб уставаць на працу кожную раніцу, Марымота аддае перавагу спосабу зарабляць, «не робячы нічога». («Я настолькі непараўнаны ў ложку, што нават прачынацца не хочацца».) Мужчына даў аб'яву ў сацсетках: «Здаю сябе ў арэнду як чалавек, які нічога не робіць. Вам складана хадзіць у краму ў адзіночку? Бракуе гульца ў камандзе? Вам патрэбен хтосьці, хто зойме для вас месца? Я не ўмею рабіць нічога, акрамя элементарных рэчаў». («— Як на гэтым месцы з кар'ерным ростам?» — «Усё ў парадку. Прыйшла сюды паўгода таму простым прадаўцом, а зараз я ўжо жонка генеральнага дырэктара».) Спачатку мужчына працаваў бясплатна, а цяпер за свае паслугі Седзі бярэ 10 тысяч іен плюс выдаткі на дарогу і ежу. Як падлічыў «гультай», за тры гады ў яго было каля трох тысяч кліентаў — па тры-чатыры ў дзень. Яны «арандуюць» Марымота па розных прычынах, але часцей за ўсё таму, што ім сумна ці самотна. З мужчынам абедаюць, балбочуць, фатаграфуюцца для сацсетак, гуляюць у парку, шчыра размаўляюць і нават ходзяць падпісваць дакументы аб разводзе. («Дзяўчына — хлопцу: «Хочаш, я памаўчу? Павер, я не кожнаму гэта прапаную».)

Ну і напрыканцы... Чарнагорка атрымала 300 еўра за... ляноту — яна выйграла чэмпіянат па ляжанні на адкрытым паветры, устанавіўшы рэкорд у 117 гадзін. («Лежачы на канапе, вельмі цяжка спыніцца».) Правілы спаборніцтваў былі простымі: удзельнікі адначасова клаліся на матрацы і посцілкі і ляжалі як мага даўжэй. («Выпрабавальнік тэлевізараў уладкаваўся яшчэ і выпрабавальнікам канап і цяпер уколвае на дзве стаўкі».) Можна было лежачы есці, піць, размаўляць, карыстацца тэлефонамі, чытаць кнігі і ўставаць у прыбіральню адзін раз на восем гадзін. («Учора цэлую гадзіну муж слухаў мяне з адкрытым ротам. Прыглядзелася — спіць, гад!») Пераможцам стала Дубраўка Аксіч, яна праляжала 117 гадзін. Другое месца заняў Мікола Башкавіч, які падняўся ўсяго за пяць хвілін да Дубраўкі. На трэцім месцы Марка Вукавіч — ён пратрымаўся 115 гадзін. («Прачнуўся ад таго, што сны скончыліся. А валяцца проста так, з заплюшчанымі вачыма, няма ніякага сэнсу».)

**Кастусь ХАЦЕЛАЎ-ЗМАГЕЛАЎ.**

# «Найлепшая ўзнагарода для артыста — увага гледачоў»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

— Калі я была маленькая, часта прымала ўдзел у розных тэле- і радыёшоу. Мяне вельмі прыцягвала гэтая сфера. Яна здавалася чымсьці неверагодным. Акрамя таго, я досыць гаваркая, мне не складае ніякай цяжкасці гаварыць на камеру. Калі зразумела, што мая дзейнасць на сцэне і выступленні ў кадры часткова падобныя, падумала: чаму б і не? Ні разу яшчэ не пашкадавала аб сваім выбары.

Па словах Юліі, пасля заканчэння вучобы найлепшым варыянтам для яе стане магчымасць сумяшчаць журналістыку і музыку.

Yuka — музычны псеўданім дзяўчыны. Пад ім Юлія выпусціла сваю песню пад назвай «А ты».

— Гэта важная для мяне кампазіцыя, паколькі яна першая, дзе я з'яўляюся аўтарам слоў і музыкі. Любы чалавек сутыкаецца з эмацыянальным выграннем. «А ты» якраз пра гэты стан. Я лічу так: усё дрэннае ў жыцці рана ці позна заканчваецца, і калі надыходзіць такі перыяд, гэта значыць, што потым будзе нешта лепшае.

Па словах Юліі, нягледзячы на тое, што гэта яе першая песня ўласнага сачынення, яна не стане апошняй. У хуткім часе дзяўчына плануе выпусціць новыя творы.



**На канцэрце да 23 лютага ў Палацы Рэспублікі, 2017 год.**

**За ўсе гады музычнай дзейнасці ў Юлі сабралася вялікая калекцыя прызоў. Але, як прызналася суразмоўніца, яны адыгрываюць для яе не галоўную ролю.**

— Мяне натхняюць кнігі, фільмы, мае сябры, бацькі, усё што заўгодна. Мне падабаецца гэты стан, таму што ў ім я вельмі працаздольная. Лічу, што жаданне ствараць можна знайсці ва ўсім. Галоўнае — захацець.

Куміра ў музычнай сферы ў дзяўчыны няма. Ёсць толькі артысты, якія падабаюцца больш за астатніх.

— Вельмі даспадобы работа Земфіры. Мне здаецца геніяльным, калі чалавек здольны сабраць шматтысячныя залы без якой-небудзь асаблівай рэкламы.

Таксама Юлію ўражваюць песні Валерыя Меладзэ. На думку дзяўчыны, у спевака шыкоўны голас, а ўсе яго песні маюць выдатныя хукі — фрагменты, якія вылучаюцца і асабліва падабаюцца слухачам, чапляюць.

— Мне здаецца, гэта артыст, які аб'ядноўвае наогул усіх.

На думку дзяўчыны, не мае сэнсу параўноўваць спевакоў паміж сабой, бо кожны творчы чалавек — асоба.

Юлія меламан, слухае абсалютна ўсе віды музыкі. На пытанне пра ідэальна выкананую песню дзяўчына назвала адну з работ ірландскага спевака Hoizer.

— Гэта Take Me to Church. У ёй выдатная аранжыроўка, круты тэкст, а голас аўтара проста шыкоўны. Лічу, што гэта тая кампазіцыя, якая ніколі не надакучыць.

**По словах Юліі, пасля заканчэння вучобы найлепшым варыянтам для яе стане магчымасць сумяшчаць журналістыку і музыку.**

У Instagram-акаўнце Юліі ёсць відэа пад назвай «Таямнічая гісторыя Б.М.».

— Пасля дзявятага класа я зацікавілася біяграфіяй Білі Мілігана: прачытала пра яго кнігу, паглядзела фільм. Гэта натхніла мяне напісаць урывак.

Юлія расказала, што пасля таго, як апублікавала ролік у сваім акаўнце, атрымала вялікі фідбэк — водгук, зваротную рэакцыю.

— Вельмі шмат людзей цікавілася, як называецца песня і дзе яе можна спампаваць. Магчыма, калі-небудзь яна выйдзе. Паколькі гэта мой аўтарскі ўрывак, ён падабаецца мне больш за ўсе іншыя відэа ў профілі.

**«Лічу, што жаданне ствараць можна знайсці ва ўсім. Галоўнае — захацець».**

Таксама ў сваім акаўнце Юлія час ад часу публікуе каверы на розныя песні.

Акрамя музыкі, дзяўчына любіць глядзець фільмы і серыялы, чытаць кнігі, сустракацца з сябрамі.

— Галоўнае — умець адпачываць і прысвячаць сабе вольны час, — лічыць суразмоўніца.

...Нядаўна на факультэце журналістыкі БДУ прайшоў Міжнародны студэнцкі паэтычны форум. На ім Юлія выступіла са сваёй песняй пад назвай «Картина за двести». Лірычны твор дзяўчыны выклікаў захопленую рэакцыю ў гледачоў, і некаторыя паспяшаліся знайсці песню ў інтэрнэце.

**Лізавета МАЛЬЧУК, студэнтка III курса факультэта журналістыкі БДУ. Фота дадзена гераіняй.**

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 12
ад 19 лютага 2009 года выдадзена
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты —
рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»,
грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Дырэктар — галоўны рэдактар
КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Адказныя за выпуск: рэдактар аддзела
Надзея НІКАЛАЕВА, рэдактар аддзела Сяргей РАСОЛЬКА.
Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
